КАЛОСЬСЕ

ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

КНІЖКА 2

ВІЛЬНЯ 1935 ГОД.

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—3.

Падпіска на год—4 зал., на паўгода—2 зал.
Адна кніжка—1 зал.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы.

ЗЬМЕСТ.

Белар. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 2. **1935 г.** **Год I.**

МІХАСЬ МАШАРА.

На прадвесьні.

I.

Няхай мы сяньня блудзім сонна,
Няхай няволіць край туга,
І як даўней—яшчэ пакорна
І напалохана душа.

Няхай мы сёньня сонна блудзім,
Няхай трывогай сэрца б'е,
А ўсё-ж да новых дзён падходзім
І хутка днець ужо пачне.

І раньню зорнаму прыветам
Мы песьню новую складзём,
І ад плянэты да плянэты,
У даль бязьмежную сусьвету
Сыгналам мы яе пашлём.

. . . .

Ад зор да зор—зьвінячым рэхам,
Мы пераклічку завядзём
І брызьнем радасьцю і сьмехам
У твар прачнуўшымся братом.

II.

Надходзіць—сьвет!..
Зьнікае цемра чорная.
Прывет табе, прывет!
Краіна—родная!

. . . .

Шмат спала ты,
І спала нярухомая.
І сьнілісь мары—сны
Табе—вяковыя.

І ня жыла —
Гніла сям'я працоўная.
Цямней за ноч была
Душа іх сонная.

Але канец —
Табе цямра нягодная;
З прасоньня паўстаець
Краіна родная.

Пяе пятух,
Лунае песьня звонкая,
У вёсцы соннай рух —
Гул—над старонкаю.

Надходзіць—сьвет.
Ўстае сям'я працоўная.
Прывет табе, прывет!
Краіна—родная.

III.

Годзі ныць!.. Годзі плакаць і каіцца,
Што прайшло, нам таго не вярнуць,
Над зямлёю зара разгараецца;
І бадзёрыя песьні плывуць.

Бійся бура шалеючы лютая,
Ня стрымаць табе марш маладых.
У грудзях нашых сіла магутная.
Па жывое ідзём да жывых.

У мінулым—цямра беспрасьветная,
І сучаснасьць—паход пад крыжом,
Толькі песьні зьвіняць прадрасьсьветныя
Уставай,
Прачынайся,
Пайдзём!

Годзі ныць! Годзі плакаць і каіцца,
Што прайшло—нам таго не вярнуць.
Пілі досыць вякамі як п'яніцы
Марных сьлёзаў муць.

IV.

Там лунае песьня —
Песьня—маладая
І да нас прадвесьняй
Новай далятае.

Вёска, вёска—што ты,
Сумная такая?

Я з табой пад плотам
Плакаць не жадаю.

Над тваей дурнотай
Ныць ужо спакінуў,
Хоць твайму народу
Буду верным сынам.

Толькі песьні: суму,
Сьлёзаў і адчаю,
Зроджаных у глуме
Думна спакідаю.

Там чаруюць поле,
Там калышуць далі,
Бяз тугі і болю,
Новай песьні хвалі.

V.

Не малюсь, каб паслаў нам прарока.
Не прашу каб ізбавіў хто нас, —
Беларусь ужо сьпіць няглыбока
І растуць ужо скрылы у нас.

Будзе дзень...
Будзе радасьць і шчасьце...
Будзе сонца над новай зямлёй.
Будуць людзі бяз слёз і праклацьця
Жыць у згодзе вялікай сям'ёй.

І аб чым так у змроку туманным
Цяпер мроім стамлёныя мы, —
Будзе зьместам прастым і рэальным
На запраўды аджыўшай зямлі.

VI.

Мне нічога, нічога ня трэба...
Мне запраўды нічога ня жаль.
Нада мной сінязорнае неба
І дарога у сьветлую даль.

І чаго нам жалець у мінулым?
Нам абрыд, наш нявольніцкі шлях.
Адраджэньня—хвалюючым гулам,
Славім песенны бунт і размах.

Дык над чым сумаваць маем, вёска?
Нам ня шкода мінулых ахвяр.
Усё жыцьцё —чорна-гладкаю дошкай
Выглядаў наш зьняможаны твар.

І пісала на ім герагліфы,
Кабалістыкай чорная моц.
І душа была казачным міфам
Зацьвітаючым —
Адзін раз —
толькі раз,
у купальскую ноч.

Ўсіх кармілі працоўныя рукі,
Ўсім служылі бяз протэсту мы,
І за гэта прыгонныя мукі
Ад усіх нам заплатай былі.

Зьмест сучасны хваліць мы ня будзем,
Вельмі цяжка так жыць, як жывём.
Толькі знаюць усе,—што мы — людзі
І па новае з новым ідзём.

Нашы новыя песьні так гулкі
І вясёлы наш марш маладых.
Прачынайся, вясковая вулка:
Па жывое ідзем да жывых.
Абарваны, галодны і босы
Не саромся... да нас—у рады!
Хай там кпяць,
Хай кідаюць пагрозы —
З намі—мы!
І запал малады!

Усю павагу мінуты мы знаем
І адказам усім, і на ўсё: —
Мы сягоньня жывым абвяшчаем,
Што да іх мы ідзём—па жыцьцё!

15.II. 1935 г.
Таболы.

Па хлеб*).

Я сяньня ўстаў рана, рана.

Устаў рана, бо сяньня іду шукаць працы. Жонка ўстала яшчэ раней і зьвязала мне вузялок з ядой, — з кіля чорнага хлеба і паўлітра малака.

Дзіцянё яшчэ спала. Баючыся абудзіць яго, я ціхачом заглянуў у калыску і выходжу на двор. Мяне праводзіў сумны і кахаючы пагляд жонкі. У мяне не хапіла сьмеласьці запытаць яе, ці яны маюць штось есьці.

На што? Ці я змог-бы штось даць ім? Ці яна скажа мне праўду? На што горш квяліць боль. А ў здагон мне штось шэпча ў душы. — Трус! Мазгай! Баішся глянуць праўдзе ў вочы? Праўда, трэба шмат адвагі запытацца ў бліскай істоты, якая аддае вам апошні кусок хлеба,—ці спакінула яна штось для сябе, згары знаючы, што ты ня зможыш нічога даць, ці спакінуць ім. І нізка спусьціўшы, як вінаваты, галаву, я выходжу на двор.

Ах, як прыгожая вясьнянай раніцай матка прырода ў абуджанай гармоніі жыцьцёвага рытму! Сонка толькі ўзыйшло і купае свае залацістыя косы ў крыштальным моры зьзяючых рос. Паветра сьвежае і чыстае. Так хочыцца жыць і чуць сябе жывым! Жаўрук сваім звонка пераліўным і безклапотным гымнам вітае ўсход залацістага сонца і пачатак новага дня, творчай вясны. На вулцы мяне чакаюць два таварышы. Мы моўчкі зьвяртаем у бок ад вёскі і ўсходзім на шырокі гасьцінец. Наўзбоч гасьцінцу, стройнымі радамі па бакох, стаяць магутна-зялёныя бярозы. Гутарыць нeяк ня хочыцца. Моўчкі ідзём і думаем кожны сваю невясёлую думку. Па абодвых бакох гасьцінца, мінаем хутары і вёскі, што будзяцца да вясновай працы. Сяляне пачынаюць веснавую працу на полі. Там і сям кружаняюць спрэжаныя ў бароны коні. Там і сям ідзе араты за плугом, снуючы доўгія, чорныя кросны ральлі.

— Мець-бы кавалак сваей зямелькі, гэтак дзесяцін з дзесятак, — думае ўслух Алесь. А да іх: гаспадарачку, сваю хатку, жонку і дзетак, — кпіць з яго Васіль, — і жыў-бы чалавек, як у Бога за пазухай! Не, патвойму лепш цягацца гэтак і шукаць працы, як са сьвечкай іголку, — адцінае той. Зусім не памойму. Памойму—сабраць нейкім парадкам крыху манэты і махнуць кудысь у сьвет.

— Дзе даўно чакаюць на цябе бліны на варотах—памагае яму Алесь,—не, брат, так, ці йначай, а гэта трэба перачакаць тут.

— Перачакаеш! Чорт ведае калі гэта ўсё кончыцца — хмурыцца Васіль.

— А куды кінешся? Ты-ж кінуўся ў рай, ды грахі ня пусьцілі. Заледзь вылізаўся, што ізноў захацелася пакаштаваць дармовага хлеба.

*) Гэтае апавяданьне ёсьць уступным разьдзелам вялікае аповесьці Машары п. н. „Запіскі безработнага вяскоўца“.—Рэд.

Васіль маўчыць. Ён заўсёды маўчыць, калі хтось робіць прыцінак да яго няўдачнага пераходу „На той бок", куды ён быў пайшоўшы ў шуканьню лепшай долі і адкуль яго вельмі хутка вярнулі і за што ён меў многа няпрыемнасьці ад тутэйшай адміністрацыйнай улады. Мо' дзеля гэтага ён заўсёды маўчаў, калі рэч заходзіла аб гэтым.

— Што ты на гэта Пятрусь?—зьвяртае памаўчаўшы ў мой бок Алесь.

Я маўчу... Душу агарнуў нейкі сьветла-тужлівы настрой. Штось расьце, расшыраецца ў грудзёх і разам з кожнай, новай зьвінячай трэльлю жаўрука падымаецца ў верх; так што аднačасна хочыцца пяяць і плакаць.

— Ён сёньня ракам паўстаў, — кідае крыху памаўчаўшы Васіль, — кінь, брат, ці гэта паможа чаму? Так ён ужо подла створаны, гэты наш прakляты сьвет.

— Шкода, цябе ня было пры тварэньню! — і зусім ён не пракляты; нат прыгожы і вясёлы. Хіба мы? А Пятруся ты не чапай! Яго рэч другая.

Алесь мае чуткую душу і далікатную пашану да чужога смутку і гора. Ён малады, мае 22 гады. Яшчэ не старую маці. Пышную курчавую чупрыну. Вясёлы, усё праносячы характар, такую сякую хаціну, карову, нейкую дзесяціну зямлі і досыць востры язык.

Васіль ужо лічыцца старым кавалерам. Мае 33 гады. Паходзіць з беднай і досыць вялікай сям'і. Абодвы яны досыць разгорнутыя, як на вясковых хлапцоў, ды яшчы з беднаты.

— Што там другая? Усім тут роўнае шчасьце. Усе мы цягнем адну лямку... Эх, закурыць-бы вось цяпер! —

— Пацярпі, крыху, браток, смачней будзе, — пацяшае яго Алесь.

Гутарка йзноў сама сабой абрываецца і мы йзноў пляцёмся ў ціхай задуме між пышна зялёных бяроз па шырокай дарозе.

Мы—безработныя вёскі.

Мы—лішнія дзеці зямлі.

Мы—з тых, праклятых ад стварэньня.

Мы—найміты і батракі ідзём шукаць працы! Ідзём шукаць магчымасьці, сумленна і цяжка запрацаваць кусок чорнага хлеба.

— І ў поце твару твайго будзеш ты есьці хлеб свой.

---

* * *

З цыклю—вандроўнае.

Вясна...
Зноў дзень чароўны мая...
Брыду у сонцы між жытоў.
З надзеяй тайнай штось шукаю
І ў сэрцы чымсь крынічыць кроў.

І так заве кудысь сьцяжына
І на траве чыесь сьляды.
Ў грудзёх настрой—юнацка-зьвінны
І ўзноў увесь я малады.

Калосьсе першае рукамі
Пяшчу з дзіцячай чыстатой
І так зьвінеў-бы з жаўрукамі,
Да сонца ўзьвіўшысь над зямлёй.

Аб тым, што так вясной прыгожа
Цьвіце зялёным ўся зямля,
І так прыемна падарожжа
Вясьняным шляхам ў глыб жыцьця.

Закінуў сум, тугу і гора,
Я рад жыцьцю—жывой красе.
Уходжу ў сонечнае мора,
Напеў складаючы вясьне.

Русалкі.

Там над рэчкай, дзе вярбіны
Пахіліліс да вады,
Дзе лазьняк, альха, ляшчына
Разрасьліся ў гай густы.

Наўзбоч гаю дзьве бярозы
Ды з дубочкам маладым
Абняліся так прыгожа,
На узгорачку крутым.

Тут вясной плятуць вяночкі
Дзеўкі з песьнямі цяпер.
Салавей-жа летняй ночкай
Разьлівае сваю трэль.

А даўней было ня тое —
Кажуць людзі, што была
Між бярозак на сустроме
Тут магілка бяз крыжа.

Ночкай толькі разгарыцца
Месяц з зорамі ў вышы.
Выплывае, весяліцца
Хор русалак у цішы.

Далікатнай павуцінай
Постаць месяц серабрыць.
Косы русыя, як ціна,
У вачох туга мігціць.

Ўсе паберуцца за рукі,
Карагод заводзюць свой
Выліваюць сум і мукі
Ціхай песьняй над ракой

Хор русалак.

Выплыў месяц, сёстры, сёстры,
Над зямлёю цішыня.

Заплятайце яго ў косы,
Выплывайце ўверх са дна.

Ночка—матка нас акрые
Мяккай коўдрай цішыні
І пад шолахі начныя
Засьпяваем, сёстры, мы.

Ўспомнім мы жыцьцё былое,
Што мінула, што прайшло,
Маладое, удалое,
Што ня вернецца ужо.

Засьпявайма, сёстры, казкі,
Пакуль месяц не пагас,
Пра каханьне, шчасьце, ласкі
І пра гора чорны час.

1. Русалка.

Я ня маю што казаці:
Бедзен мой кароткі век;
Жыла ў мачыхі—бяз маці
Гора бачыла і зьдзек.

Цяжкім быў мой лёс сірочы,
Злая мачыха мяне
Утапіла цёмнай ночай
У глыбокім амуце.

Хор.

Шэльму бабу, ведзьму злую,
Дружным хорам праклянём,
А сіротку маладую
Песьняй гучнай памянём.

2. Русалка.

Пад бярозы, сёстры, сёстры,
Пакуль месяц не пагас.
Я ўспаміну пушчу кросны
І сатку вам мой расказ.

Хор.

Сядзім, сёстры, пад бярозы
Карагодам на траву.
Звонкай песьняй заварожым
Летняй ночкі цішыню.

2. Русалка.

Там за гаем, пад гарою,
Калісь вёсачка была.
У тэй вёсцы над ракою,
Тэй парою я жыла.

Невялічка была хатка,
Небагата мы жылі.
Ўся сямейка—бацька, матка,—
Гаравалі, як маглі.

Паднявольля злая доля,
Горкі, ты, прыгонны лёс.
Ўсё знасілі—зьдзек і болі,
Вылівалі многа сьлёз.

Цяжка ў полі працавалі,
Над сьпіной сьвістаў бізун.
Лютым катам быў над намі
Панскі найміт і цівун.

Хор.

Сёстры, сёстры—ўсю нядолю,
Ўсё цярпеньне, боль і зьдзек,
Паняверку і няволю
Праклінаем мы на век.

2. Русалка.

Каля нашай хаты з боку,
Жыў сусед—крывы Марцін.
У Марціна—чарнавокі
І прыгожы надта сын.

Мяне звалі—Кацярына,
Яго клікалі—Максім.
Ён—дзяцюк, а я дзяўчына,
Жыць хацелася жывым.

Пакахала я Максіма,
Пакахаў Максім мяне
І былі мы так шчасьлівы,
Як шчасьлівы—толькі ў сьне.

Хор.

Кацярыну і Максіма
Сёстры, сёстры, памянём.
Пра хлапца і пра дзяўчыну
Хорам песьню прапяём!

2. Русалка.

Наша шчасьце мы пясьцілі
І хавалі, як маглі.
Часта ночкай прыхадзілі
На узгорачак сюды.

Зоры чулі, як шапталі
Нашы клятвы—век кахаць
Прысягалі, прыракалі
Сваю долю адшукаць.

Краскай пышнай зацьвіцела
Ў сэрцы радасьць пачуцьця
І як ў казцы пасьвятлела
Сьцежка шэрая жыцьця.

І на памяць дзён шчасьлівых
Тут на ўзгорачку крутым
Дзьве бярозкі пасадзілі
І дубочак малады.

Хор.

Час вясёлы, час шчасьлівы,
Што мільгне, як сон, жыцьцём
І зьнікае дзіўным дзівам
Сёстры, сёстры, памянём!

2. Русалка.

Але радасьць так каротка;
Шчасьця блісьне толькі міг
І дарэмна так салодка
Сэрца б'ецца у жывых.

Лепш тэй красцы не цьвіцеці,
Што спаткаецца з касой.
Ходзіць горачка па сьвеці,
Бяду водзючы з сабой.

Ні якой жывой крыніцай
Волю ў сэрцы не згасіць.
Лепш таму і не радзіцца,
Хто ў няволі мае жыць.

Хор.

Ні якой жывой крыніцай
Сэрца смагу не згасіць,
Лепш таму і не радзіцца,
Хто ў няволі мае жыць!

2. Русалка.

Нечаканая, здалёку,
Падыйшла да нас бяда.
Зашумела ўсё навокал,
Загудзела грамада.

Ў панскім боры пад саснамі
Ноч у ноч гарацъ агні.
Між рабамі залуналі
Гарачэй агня славы.

І што ноч, то горш сваволюць,
Людзі воляй у бары
І да іх з усіх ваколіц
Пайшлі хлопцы—бунтары.

Хор.

Слава тым, хто промень волі
Ў сэрцы сьветачам насіў
І працуючых з нядолі
Падымаючы будзіў!

2. Русалка.

Кліч дайшоў і да Максіма
І Максім пайшоў да іх.
Я дарма яго прасіла,
Не паслухаў слоў маіх.

І Максімка, мой любімы,
Чарнавокі мой... і ён,
Бунтаром пайшоў з дубінай
Здабываць сабе закон.

Загарэлася змаганьне,
Закіпеў сьмяротны бой,
І крывавае паўстаньне
Залунала над зямлёй.

Хор.

Хто за праўду йшоў змагацца
І за крыўды, боль і зьдзек,
Хто з жыцьцём нат змог
расстацца,]
Той запраўды—Чалавек!

2. Русалка.

Яркім полымем пажараў,
Сьмерцю жорсткаю ў баю
Правы новыя пісалі,
Праўду новую сваю.

Задрыжэлі перад імі
Багачы і свалата.
Разгулялісь па краіне
Бунтары і галіта.

Сьветазарнаю вясёлкай
Усьміхнулась воля ім.

Усьміхнулася—ды толькі
Хутка згасла у крыві.

Хор.

Не загасьне, не, ніколі
Сьветач праўды на зямлі
І людзкую смагу волі
Ня утопіш у крыві!

2. Русалка.

За Дзьвіною чорнай хмарай
Разаслаліся палкі.
Па крывавую ахвяру
Прышлі—кат і казакі

Й па загаду царскіх катаў,
Шлі салдаты на братоў
І чынілі суд—расплату
Над сем'ямі бунтароў.

Вёскі гінулі ў пажары,
Людзі—ў петлях і крыві,
Ўсё дрыжэла перад карай,
Пекла стала на зямлі.

Хор.

Хто за волю гінуў сьмела,
Хто змагаўся і цярпеў!
Толькі той у праўду верыў
І па праўдзе жыць хацеў!

2. Русалка.

Улавілі і Максіма
Цёмнай ночкай у бары.
І павісьлі на асіне
Нашы хлопцы—бунтары.

З вёскі нашай—тэй з-за гаю
Засталіся—вугалькі
І пайшлі далей па Краю
Сьмерць, пажар, і казакі.

Страх усюды... енк і сьлёзы.
Праклінаў жыцьцё—жывы,
Цёмнай ночкай, да бярозак,
Я прышла адна сюды.

Памянула тут Максіма, —
Перажыты шчасьця міг.
Так балюча сэрца ныла,
Стаў нямілым сьвет жывых.

Ціха рэчанька бруіла,
Штось шаптаў чарот вадзе
І салодка так маніла
Супакоем да сябе.

Мяне клікаў чорнавокі,
Яго голас чуўся мне;
І амут, амут глыбокі,
Як дачку прыняў мяне.

Хор.

Мы ахвяра злой нядо
Гора горкага і бед.
Ўсе, як цяжкую няволю,
Пакідалі белы сьвет.

2 Русалка.

І прачнулася русалкай
Мая чыстая душа,
Бяз трывог і смагі палкай,
На дне чыстым амута.

Рыбакі злавілі цела
Са снапом аўсяных кос
І з трывогаю нясьмела,
Пахавалі між бяроз.

Але блекнуць сталі росы.
За ракой пяе пятух.
Дык хутчэй зьнікаем, сёстры,
Пакуль месяц не патух.

Хор.

Ужо блекнуць сталі росы,
За ракой пяе пятух.
Дык хутчэй зьнікаем, сёстры,
Пакуль месяц не патух!

Таболы
24.I. 1935 г.

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА.

Яшчэ адна вясна.

Мінулі халады і сьнег дадзелы тае...
У лужынках вады, у белых аблакох,
У яркай сіняве, што ў небе расьцьвітае
— Вітаю я вясну на полі, між дарог...

Йдзе новая вясна... йдзе новая адвечна,
Як сотні год назад—праменны, дзіўны чар.
А сэрца горкае смуціцца недарэчна,
Бо для яго што год... слабей вясеньні жар.

Калісь расло яно, ірвалася увышу,
Збывалася вясной хаценьняў і клапот.
Цяпер-хоць зноў вясна—шукае сэрца цішы,
Ня сьніць, не лятуціць—закутае у лёд.

І нават слоў няма, каб прывітаць гарача
Каханую вясну так, як калісь, даўней.
Ўсё-ж нешта у душы пяе, а можа плача?
І сонца сьвеціць мне ясьней, ясьней, ясьней.

М. ДАЛЬНЫ.

Сыпаліся вішнёвыя краскі.

У кішані сьціскаў фінскі нож. Другой рукой моцна прытрымліваў яе. Рытмічна раздаваліся шагі. Адліга. А далёкія агні, як лямпачкі, у тумане. Прадмесьце Вільні. Нізенькія домікі. Пакрыўленыя платы.

Прыціскае моцна за руку. Валасы яе ў стылі фільмовых артыстак. Разьвеяныя—як на ветры—з пад бэрэту пяшчотна казычуць шчаку. Яна! Пяе яна ў сэрцы нечым вясеньнім. Здрадлівыя завулкі прадмесьця. Нярaз крычыць у мёртвую глуш дзікі голас. Нярaз надрываецца нейкім плачам крыўда, нярaз п'яныя галасы рассыпаюцца аб шыбы акон.

Крокам пэўным ідзе.—А вочы—быстрыя.

Вядзе ён бой за дзяўчыну. А прадмесьце не сваіх ня любіць. Але сягоньня прайшоў спакойна. Ніхто не зачапіў.

Вось і варотцы. Разьвіталіся. Абняў моцна. Пацалаваў доўгім пацалункам. Мяккая пяшчота абдала жарам. А яна пабегла. Памахала на сходках рукой.

Пастаяў крыху, бо ў сэрцы нешта недаказана, нечага не хапае. Глянуў у даль вуліцы. Шэра. У паветры павісьлі рэдкія ліхтары. Засьвяцілася акно. І цень — як крыло вялікай птушкі— замітусіўся — за фіранкай. Пастаяў і паволі пабрыў да цэнтру

места. А ў сэрцы нешта недаказана. Нечага не хапае.—Усё бліжэй, бліжэй вялікія—радасныя агні. Шумныя вуліцы. Расьцягнуліся шнюром вялікачацьвярговыя сьвечкі—агні.

П'яніць адліга.

Абарвалася срэбраплынная струна. Абляцелі беласьнежныя кветкі. Разьвеяліся злотаіскрыя мроі.

Ах—яна! Дзяўчына прадмесьця! У сэрцы кіпіць, кіпіць. Што ён мог зрабіць? Гімназіст. Выабражае. Яна з шофэрам—муж!—едзе. Палахлівая! Не! Яна невінавата! Яна... нават уцякла з вясельля. І доўга туліў яе ў гарадзкім садзе. А пасьля — уцёк, як шалёны. Бег, а сэрца то білася прыбоямі,—то замірала зьнямогай. Не! Яна — невінавата! А пасьля — яе бацька, пагрозы. Дзе яна? Былі разам!

Паплылі хворыя дні.—У адчыненае акно плакаў сум з струн. Вучыўся змалку іграць. Маса акуркаў на падлозе.

А вясна сьмяялася.

Лекцыі. Сонца радасьцю пераліваецца на школьных лаўках. За акном зялёныя покаўкі. І чароўная недасяжная даль за дахамі.

Лекцыі. Усё глупства. Ну і што? Што з гэтага? Які сэнс? Купала пісаў. Напісаў „Раськіданае гняздо". А цяпер піша аб Сталіне. Бесканечнасьць і вечнасьць. Як зразумець? А чалавек кожны дзень глытае бактэрыі. Вось у клясе — на вуліцы—усюды—тэ-бэ-цэ. Сьмерць. І ён памрэ. Ляжыць белы—навокал кветкі—калегі глядзяць. Жаўцеюць старым воскам сьвечкі—зіхацяцца пазалочаныя абразы. Вечная памяць. А які-ж сэнс усяго?

А вечарам. Сіня-сьветлае неба. Неапісаная хварба. Рожавеючыя просьвецьці вечарэючых вуліц.

Вечар.

На вуліцах рух.

Вясеньнія вопраткі.

Сходкі ў падвал—кнайпа. Столікі.

Скрыўленыя твары. У люстры бледны твар—белая палатніна. Душна. Муць. Агідна і сорамна. Безнадзейна балюча. Сядзіць нярухома. Прыходзяць мужчыны — кабеты. Відаць ножкі вышэй кален. Сьмех. Вось дзе першабытны чалавек.

Ня памятае. А калегі—так—так—калісь палілі ў клясе анучкі—чад рабілі, каб звольнілі з лекцыяў.

Гаворань нешта.

Гул толькі. Русь. Расія.

Так—так. Усё роўна.

А пасьля—туман.

Афрыка. Пяскі. Сонца пячэ. А ён ідзе з сябрамі—у няведамую даль. Згіне ў чужыне—невядомы—забыты.

На канвэрце надпіс.

.... Консулят ..... аддзел чужаземнай легіі.

Думкі плывуць далёка—далёка. Лета, у садзе раськідана на галінах радасьць. Пахне зеленьню і мёдам. За платамі рожавы летні вечар. З мястэчка з ветрам набягае аркестра. Молада і пяшчотна пяюць гукі ў паветры.

За сталом у садзе бацька і маці. Прад імі паведамленьне гімназіі.

— Што гэта з ім?—пытае бацька. І ціха апускаецца галава. Быццам не пяюць молада гукі,—быццам ня пахне зеленьню.

Перавялі ў VIII-ую клясу. Цягнік прымчаўся з сінеючага прастору. Сьвежасьць вечару. А ў садзе яшчэ цьвітуць кветкі і—яблычны пах. Успаміны. А на душы соладка і спакойна.

— У Вільню!

Студэнскі Саюз. Накурана. Сіня. Прамаўляе студэнт — эмігрант.

— Мы—Беларусы.

— Гісторыя пайшла наперад.

— Мы—моладзь.

— Ня здрадзім народу.

Разыйшліся шумна. Правёў студэнтку. Ізноў—як тады—прадмесьце. Цёмная ноч. У сэрцы—новы напеў.

Ішоў назад. Глуха адбіваюцца шагі. Успаміны. Фінскі нож. Расія. Русь!

О, як прыемна тварыць новую гісторыю.

Новае ў сэрцы.

Бе—ла—русь.

Яна выяжджае. Зайшлі ў вагон. Закурылі. Яна курыць! Пачуў, што пакахала. Напішаце?—Напішу. Яшчэ раз—ужо цягнік рушыў—пытаньне: напішаце? Адказаў — замахаў рукой. Паволі плылі вагоны. Зьніклі вочы. Але ведаў: і бачыць яго. Згінуў цягнік за стрэлкамі і рэйкамі. Ужо поле беларускае сьмяецца ёй.

У садзе—студэнты — студэнткі. Дыскусія. А пасьля гітара, песьні. Сыпаліся краскі вішняў. Ціха кружыліся ў рожавым вечары. Міхась ляжаў на траве. Сыпаліся вішнёвыя краскі. Кружыліся. І кружыліся думкі.

Балёнік.

Прывяла Агата кароўку ў места прадаваць. Да паўдня стаяла. Мух адганяла. Таргавалася. Прадала ўрэшце. Падвязала Агата мацней хустку, грошы—у вузёлчык ды моцна сьціскае, каб ня згубіць дзе. Ідзе ды разглядаецца. Што-б гэта купіць? Грошаў шмат ня выдасьць: паўморга зямлі яны ў Сьцяпанчыхі купляюць. Але вось для дзяцей гасьцінчык купіць так яе штось і тоўхае. Захацелася ёй балёнік купіць дзеткам. Такі-ж ён забаўны! Усьцешацца моцна. Каштуе, пэўне, няшмат, а дзецям радасьць вялікая. Раскруціла асьцярожненька вузёлчык у хустачцы і выняла дробненькую манэтку. А балёнікі пераліваюцца небам вясковым, быццам чысьціня нябесная ў іх адбіваецца. Калышуцца балёнікі, як карабельчыкі разнакалёрныя, ціха, стройна плывуць пад гоман кірмашны. Не ўцярпела Агата — купіла балёнік ды моцна ў руцэ трымае. Каб хлапец які вясковы, разудалы, жарту не састроіў, з рукі ня выбіў. Пагляне Агата на балёнік, а ў ім — кірмаш увесь разгарнуўся, а ўсё, як быццам за імглой чароўнай, як быццам зямля разгораная дыхае раніцай сьвежай... Цягне Агату гэтая чысьціня нябесная, вабіць сінь пераліўная. А ў сэрцы—радасьць матчыная.

Сьціскае Агата балёнік, ды грошы ня ўпускае. Але кепска так, нязручна, нявыгадна. Узяла ды прывязала вузёлчык з грашыма да балёніка. Разам сьціскае. Цяпер—пэўная. Ідзе па рынку. Суседку сустрэла. Загутарылася. Кароўкі, вядома, шкада, але купяць цялушку. Канечне купяць. Няма й мовы. Каб хоць сэрца павесяліць. Але паўморга ня выпусьцяць. Так надарылася, побач іх поля якраз... Лугам, праўда, ідзе ладны кавалак, але вырабяць з часам...

Паправіла Агата хустку ды не заўважыла, як балёнік паплыў ціхенька, роўненька. Толькі, як ужо над крамамі падняўся ды ўсе пазіралі з цікавасьцю—схамянулася. Божа-ж мой! Людцы мае! Анямела Агата. Кінулася бегчы, енчыць пачала. Стала Агата белая, як палатно. Дрыжыць уся. Калоціцца. У грудзі біць пачала. А балёнік плыў і меншаў. Паволі падымаўся ў неабнятную сінюю вышыню.

Каб як яго ўхапіць, каб падскочыць ды дастаць. Каб пярун у яго ўдарыў. Усе глядзелі навокал Агаты. А ёй чамусьці прыпамяталася, як у месячную ноч яна з цёткай Дамініляй ячмень жала. Сьпелы, прасьпелы ячмень. Сыпецца, як град. Ціхенька яны сярпамі займаюць, асьцярожненька складаюць на перавяселцы. Шасьцяць каласы і пакорна ўміраюць пад сярпамі серабрыстымі. А ночка месячная такая... І тады яна з Дамініляй аб паўморгу пачала лятуцець.

Ад гэтых успамінаў Агата ня ўстрымалася й выбухнула плачам. А мае-ж вы, родненькія, а мае-ж вы, саколікі...

Дарога ў вёску пачыналася блізка за рынкам. Пахнула ў твар сьвежасьцю палёў, а навокал, дзе ні глянь, разгораная, пухкая зямля вабіла нейкім цяплом і сырасьцю. 1934 г.

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ.

* * *

Цягнікі і станцыі —
У шыбе—сонца сполахі —
Родная краіна — —
Ты плывеш—плывеш — —
Поле —
Апяянае Купалай і Коласам —
Паясамі слуцкімі сьцелецца ў бязьмеж —
У гэтай далі сонечнай —
Калыхацца сьпевамі —
Птушкай лёгкакрылаю ў небасхіле млець —
У гэтай далі сонечнай
Каласамі сьпелымі —
Сінім летнім вечарам ціха шапацець —
На шляхох бярозы шэраньню займляцца
Падаючай зоркай —
блісьне цімафор —
Вечар навявае сэнс дзіўной загадцы
У блакітным тумане пацеркамі зор —
Еду —
еду — —
еду — — —
Цішыня навокал —
Толькі ў сэрцы п'яна —
звонкі перапуд —
Толькі заграхоча —
то замрэ—далёка — — —
Перагонка колаў—разьвясёлы гуд —

* * *

Ноч ужо.
Я ня сплю.
Не кладуся.
Белы месяц праплыў даўно
Ў мітусьлівых дум завірусе,
Не засну я спакойным сном.
Ўспамінаю.
Розныя твары
Выплываюць з мінуўшчыны дна.
Часта мы аб нечым марым,
Што ў жыцьці было...
як вясна.
Дні насталі ўжо вясеньнія.
Ноччу—намаразі серабро
Мо' таму караблі—лятуценьні
Паплылі кудысь уразброд.
Разьзьвінелася сэрца трывогай.

Чую нейкі на вуліцы крок...
Як прыемна ў хвіліну зьнямогі
Лавіць з станцыі сьвіст—гудок.
Ноч ужо.
Я ня сплю.
Не кладуся.
Белы месяц праплыў даўно
Ў мітусьлівых дум завірусе
Чую нейкі крык за акном.

1935 г.

А. БЯРОЗКА.

Зімовым вечарам.

Пад ціхі шум твайго верацяна
Снуюцца думкі пloймамі —
Узоры ткуць ў лучыны сінім дыме
І ўецца ніць, як тонкая струна.

Кажы, бабулька, казку векавую,
Што вее чарамі заклятых сноў;
Хай слова ціхае ўскрынічыць кроў,

Патушыць сум і душу зачаруе.
Ўлажы ты ў словы дух сівых вякоў,
Дыхні ў іх волю моцную, сьвятую,

Што ў сэрцы загуляе, як вясна,
Як Нёман, хвалі бурныя падыме...
Мо' сьціхне жаль прад казкамі тваімі,
Мо' змоўкне боль пад шум верацяна...

* * *

Грам. Машары на выезд у Гдыню прысьвячаю.

Заснула ноч. Павісьлі ціха зоры
У цёмным небе панад марам бурным;
На хваль хрыбтох вятры пяюць ноктурны
І ходзяць хвалі—вадзяныя горы.

Там грані скал развесіліcь на моры,
Як чарапы разьбітай чорнай урны;
Вятры галосяць нейкі плач хаўтурны,
Ім глуха ўтораць водныя прасторы.

Вось выплыў месяц ціхі палахлівы;
Нейк сумна, сумна неба даль чарнее;
Навісла ймгла заслонаю маўклівай...
Патухлі ў думках мроі і надзеі...
Я тут адзін. Далёка нашы нівы...
Ад Бацькаўшчыны вецер не павее...

6.X. 1934 г.

Фрагмэнт.

Ноч сьціхла. Імгла над зямлёю насілась
І ледзь-ледзь прыметна трава варушылась,
Здалёка дзесь шум данасіўся.
І месяц задуманы выплыў над борам

І жабы ў балоце азваліся хорам...
Туман над ракою зьявіўся.
Шаптала штось вішня таполі ля хаты,
Пад імі вясёла пяялі дзяўчаты;

У лесе глухім штось гукала...
Над рэчкай таёмныя цені мігалі —
А песьні ліліся, душу калыхалі —
І сэрца чагосьці чакала.

* * *

Шуміць Нёман...
За хваляю хваля ідзе
І ў бурлівай пяністых хрыбтоў чарадзе
Там, далёка, б'е ў бераг высокі.
З шэрых даляў даносіцца гоман:
Вецер гудзе, шуміць —
Шумяць сухія асокі...
Вецер б'ецца, а хваля бяжыць
Ў бездарожны, далёкі прастор...
Мо' няма там нуды,
Ні няволі, няшчасьця і сьлёз?
Можа хвалі імкнуцца туды,
Дзе пад ціхімі іскрамі зор
Расьцьвітаюць вясны лятуценьні
І дзе сонца зіяюць ірдзеньні,
Дзе апошні енк болю заціх,
І дзе ў сэрцах людзкіх
Хрыстос ускрос?..

З Усходняе Беларусі.

ЯЗЭП ПУШЧА *).

Мне чупрыны ня хочыцца зьвесіць.

Беланогі, расчухраны месяц
лявоніць у лісьці кляновым;
мне чупрыны ня хочыцца зьвесіць
ў гэты вечар аўсяна-зялёны.

Хай туман сырадсем абмые
мае веснамайскія кудлы.
Затуліўшыся ў сочнай каліне,
расцалуюся з месяцам блудным.

І пайду сінявою мурожнай
да начлежнікаў хлопцаў буяных.
Хай прыгорне мяне вербалозьзе,
бо я хмелем сягоньнешнім п'яны.

Ой вы, поплавы, ў шэрай сярмязе
веснавейце ў лагчыне імглістай!
Мяне променем сонца абвяжа
напярэдадні ў зелені лісьцяў.

Закалосяцца песьні па лесе,
усьміхнецца, як раніца ў клёне.
Ой, чупрыны ня хочыцца зьвесіць
ў гэты вечар аўсяна-зялёны!

---

*) Язэп Пушча (Плашчынскі) зьяўляецца адным з найбольш выдатных і глыбокіх лірыкаў Усходняе Беларусі. Радзіўся ён у сялянскай сям'і ў 1902 г., у Ігуменскім павеце Меншчыны. Друкаваць свае вершы пачаў у 1923 г. У сваей аўтобіографіі ён пісаў: „Мне вельмі падабаецца вобразнасьць народнай поэзіі, я хацеў і хачу ўдасканаліць яе ў сваей рытмічнановай песьні". І сапраўды, вершы свае стылізуе Пушча на ўзор народнае песьні, удасканальваючы іх даволі вялікім талентам. Яго лірыка носіць шчыра суб'ектыўны характар, у якой часта спатыкаем матывы глыбока патрыётычныя. З гледзішча артыстычнага творчасьць Пушчы вельмі цікавая. Поэт, рэалізуючы постуляты сучаснае поэзіі, стараецца, каб верш ягоны быў сьпеўны і свабодны, адзначаўся сьмелымі і арыгінальнымі прыраўнаньнямі і выражэньнямі. У мове Пушчы спатыкаем вельмі многа поэтыцкіх нэолёгізмаў, умела створаных поэтам. У апошні час быў Пушча моцна прасьледаваны бальшавіцкімі ўладамі. Што з ім сталася, ня ведаем. Адно ведама, што Пушчы нічога цяпер ня друкуецца ў Усходняй Беларусі. Выдаў наступныя зборнікі вершаў: „Раніца рыкае", Менск, 1925; „Vita", Менск, 1926, „Песьні на руінах", Менск, 1929 г.; апрача гэтага многа яго твораў друкавалася ў розных часапісах. Першы верш Пушчы перадрукоўваем з „Выпісаў з бел. літ. XIX і XX ст." У. Дзяржынскага, Менск, 1926 г., тры апошнія—із зборніку „Песьні на руінах".

* * *

Я сын дубровы круглалістай,
я сын сялянскіх ураджаяў.
О, як да сэрца гэта блізка! —
яно хмель—песьню абуджае.

Скажы, „рахманая“ о вёска,
чаму люблю твой твар я загарэлы?
Чаму напеў я свой расплёскаў
па сонца жытняй акварэлі?

Чаму вясна зялёным малачаем
у песьні любіць усьміхнуцца?
Няхай, няхай рабочы прабачае,
што я поэт сялян—„бяспуцьця“.

Даруй і ты мне, златазубы горад,
што я пясьняр табе нияродны.
Ой не запражэцца больш у песьню гора, —
яно сплыло ў раздум'і бродам.

Сплыло у цемень дзён мінулых
і стуль ня вынырне на хвалі;
але нашто нам песьні муляць,
калі ў іх толькі поўдзень хвалім?

Жыцьцё-ж бывае часта рубам, —
ну, дык аб чым-жа пець сягоньня нам?
Ці-ж толькі аб фабрычных трубах,
што дымяцца між жалезных брам?

. . . .

Няхай паслухае лапцюжнік
напеў прасьцяцка-сакаліны,
няма ў ім болей слоў: ланцужнік,
жыцьцё—расьцьвіўшы куст каліны.

Няхай памые вечар бровы
у вадаспадзе яго ліp—частушак.
Я к вам іду, лясы, дубровы,
у зычным звоне песень—птушак!

Дык слухай, вёска, не скажу ніколі,
што я твой ліст, вясной апаўшы,
што сэрца маё восень кволіць,
што для цябе я ўжо прапаўшы.

О не! Я сын тваіх аколіц,
тваіх кашуль, хоць і радняных,
і сэрца радасьцю сваволіць,
як толькі ўспомню пра парканы.

* * *

Эх, вёска!
Саламяная радасьць дуброў,
ну чаго так зайшліся цымбалы?
Ці ня высеяць хочуць мінулага боль,
палыном што у сэрца запала?

Яе выпіў я поўную чару
ў застаронку мужычых сяліб.
Мне тагды усьміхаліся чары,
калі сонца цадзілася з ліп.

Мае вусны ня ведалі сьмеху,
ён у прочках блукаў без мяне.
Бывала, як едзеш з начлегу,
ён шопатам ціхім каня абміне.

Дык, мае залатыя цымбалы,
насявайце балючыя зыкі!
Ня ўзыйсьці ім у новую весну.
Гэтак грае апошні музыка,
ля вясковых паломаных весьніц.

На ростані.

Прастор, агарунены шумам бяроз,
Напевы рассыпаў у хвалях крынічных.
Мэлёдыі іх разьліваюцца скрозь,
Мэлёдыі іх у маршчынах аблічча.

Лазьняк на балотах увесь не пасох, —
Шчэ доўга з ім будуць хістацца чароты.
Краіна мая шумазвонных лясоў,
Твае на курганах губляюцца тропы.

Праходзілі імі вячэрняй парой
Ў навале сузмроку навалы чужынцаў.
З іх кожны ў пакорнае вока пароў,
Крывавай сьлязою хацеў пажывіцца.

На ростані ўсходня-заходніх дарог
Цябе, дарагая, яны ўкрыжавалі;
Твой сын весялосьці таму й не зьбярог,
Згубіў ён яе у шалёных навалах.

А ветры разьнесьлі з імглой навальніц,
Таму вось, часамі, й заходзяцца струны,

Таму вось, часамі, душа і смыліць,
Бы хто палівае пякельны яд-трунак.

Прастор, агарунены шумам бяроз,
Напевы рассыпаў у хвалях крынічных.
Мэлёдыі іх разьліваюцца скрозь,
Мэлёдыі іх у маршчынах аблічча.

Як люба тут...

Як люба тут, ля родных каляін,
Дзе сонца з ветрам песьню калыхалі;
Іду сьцяжынай сумнаю адзін
І зрок губляю ў задумённых хвалях.

Душа мая расхрыстана зусім, —
Усе з яе сарваны параліны.
Якая сочная над лесам сінь,
Якія тоны ў жытніх пералівах!

Дуброва ветліва ківае галавой;
Гамоніць з далямі сівая Сьвіслач.
Крынічны плёск на росных паплавох
Сялянскія люляе думы-мысьлі.

Я тут правёў свайго маленства дні,
Тут беднасьць песьціў кволымі рукамі.
Здаецца мне—за ўзгоркам сьпелых ніў
І сёньня, як і ўчора, раніца рыкае.

У гэтай, у вялікай прастаце
Прыгожае пазнаць мне давялося.
На вадапоі дзён краса расьце, —
Хвалюецца, шуміць яе калосьсе.

Зажынкі я спраўляю кожны год, —
Мэлёдый сонечных люблю пахмельле.
Адным кілішкам п'е са мной народ
Пітво не падфарбованае зельлем.

Суседзям-жа з кляновых дам дайніц,
А з чары сэрца дам сваёй матулі.
Хай песьня льлецца музыкай крыніц,
Хай да сябе асьмееных прытуліць.

Ня стлеў, ня згас!

Вярнуўся зноў да родных берагоў, —
Тут хвалі дзён паіншаму шумяць,
Тут хвалі дзён пайшлі у карагод —
Плыве чубоў зялёных сенажаць.

Гады мае, майго юнацтва дні,
Ня ведалі вы ўцешнасьці часін!
Прайшоў я з вамі скрозь людзкой ганьні,
Бы вецер—шэлестам сівых асін.

Прайшоў і рукі ў далях распасьцёр, —
Маіх суставў ня ўкурчыў яшчэ курч.
Пачаў гукаць там да сваіх сясьцёр:
Нясеце мне залочаны мой ключ!

— Я сёньня адамкну ім Сьпеў Зямлі,
А зорацца мэлёдыі жыцьця.
Лістамі клёны ў сіні разьвялі
І сонца мне разьвесіла свой сьцяг.

На ім тады пакінуў надпіс я, —
Пачалі ўчытвацца ў яго здалёк.
Сачылася па сонцы кроў з пісьма,
Як-бы з параненых багнэтам шчок.

Затрэслася істота ўся мая,
Ў ваччу паўзьлі зьмяіныя вякі...
Якраз тады пясьнярская сям‘я
Ішла аздобліваць чало ў вянкі.

— Як многа зьзяе у тумане зор,
Праславіць хай іх ода, гімн! —
Які пабожны і пакорны хор
Ім славіць толькі з кліраса багінь.

Ня хочу я складаць на гэты лад, —
Для ўцехі старасьці пакіну вам.
Ах, як шуміць запушчаны наш сад!
Яму свой сьпеў засмучаны аддам.

Пайшла сям‘я да славы лёгкіх слоў.
А я спрачаюся з сабой, з людзьмі.
Няўжо шляхі да песьні занясло
І пыл назойлівы яе зацьміў?

Няўжо так сталася, няўжо?
О, не зьняверуся й на гэты раз.
У садзе ліст апошні не ажоўк,
А ў песьні жар ня стлеў, ня згас!

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ *).

Воўчы лог.

Хараша ў полі зімою... У полі асьнежаным, дзе такія гурбы прыгожыя, неахопная шырыня і празрыстае неба, што пачынае цямнець з надыходам вечару.

Серабрыцца сьнег, мігацяць нязьлічоныя мільёны брылянцістых іголак, вецер-кусака шчыпле шчокі і нос. Забіраецца за каўнер, нявідзімкаю прабіраецца пад кажух з сваёй халоднай пяшчотай. Тулішся, пацягваешся, падбіраеш пад сябе ногі, да якіх вельмі ахвоч мароз з сваімі балючымі пацалункамі.

Але ўсё-ж ткі добра. Так бадзёра скрыпяць палазы, сьнежны пыл ляціць з-пад капыт, абдае цябе ледзяністымі пырскамі, аж зажмурваеш вочы. А коні бягуць — падганяць ня трэба—дарога—крышталь, дарога сьлізкая, чаму-ж ня бегчы.

Надыходзіць вечар, сінеюць сьнегавыя гурбы, ад бледнага месяца цягнуцца празрыстыя промені і ня зьзяюць, а тлеюць над лесам і полем. Сінія цені плывуць за кустамі, кладуцца ў баразёнкі, у сьнегавыя калдобіны. А зоры, тыя нібы вылецець хочуць з сваіх недасяжных гнёздаў, да таго зыркія, бліскучыя яны ў марозным паветры.

І салодкі сум закрадаецца ў сэрца, ціхі сум, непазнаны. Здаецца, што пяюць над табой срэбныя жаўранкі, заліваюцца таемныя бомы цудоўнымі танюсенькімі пераліўамі, якія казычуць кроў, перамешваюць радасьць і сум, акунаюць цябе ў нябыцьцё... Нібы вясна абыймае цябе пахучымі кветкамі.

Ты пачынаеш драмаць...

— Н-но... гняды...

І зноў скрыпяць палазы, скрыпяць упарта і мілагучна. Іх скрып далёка разносіцца па полі, здаецца, ад гэтага скрыпу зацярушыўся сьнег вунь з тае сагнутай галінкі бярозы, што прытулілася ля дарогі.

Скрыпяць палазы...

А ноч спускаецца ніжэй і ніжэй на сьнегавыя абшары і ўсё навокал пачынае прымаць воблік нявыразнай фантастыкі. Вунь бяроза насоўваецца на нас нязграбнаю цёмнаю гурбаю, дубовы куст—ня куст, а таемны цуд. Нават здаецца, што варушыць ён пакручастымі рукамі, маніць, вабіць да сябе варожай таемнасьцю. Цішыня навокал, ні гуку, ні зыку, і яшчэ больш панадліва скрыпяць палазы.

Уяжджаем у лес. Спачатку рэдкія хвойкі, голыя бярозы, алешнік. Чым далей у лес, тым гусьцей дрэвы, тым вышэй ма-

---

*) Аб творчасьці Міхася Лынькова чытач даведаецца із рэцэнзіі ягонай повесьці „На чырвоных лядах“, якую зьмяшчаем у гэтай кніжцы „Калосься“. Апавяданьне „Воўчы лог“ перадрукоўваем із зборніку пісьменьніка „Андрэй Лятун“, Менск, 1930 г.—Рэдакцыя.

гутныя сьнегавыя шапкі, што маўчаць, не зварухнуцца, нібы думаюць думу, нібы мараць у халодным сьне. Аб чым? Запытай іх, мо' даведаешся. Мо' аб леце цёплым, аб прамяністым сонцы, аб бярозавым соку вясновым, аб бліскучым дубовым лісту... Маўчаць сьнегавыя шапкі, пахіліліся галіны пад белым уборам. Унізе змрок і ў ім бледыя плямы ад месяца. У іх калмаціцца асьнежанае ламачча-гальлё, выступаюць пні ў прытульных сьнегавых ямках.

Добра ў лесе і страшна, прызнацца. Прыгнятае нязвычайная цішыня, якая нібы павісла ў паветры, не зварухнецца. Толькі гайданецца часам галіна і пасыпіцца з кудлатае хвоі срэбны пух, зацярушыцца ціха, ціха па зялёных іголках. А вуха адразу напружана ловіць гэтыя ледзь чутныя гукі, настарожваецца, гатова праглынуць, уцягнуць у сябе ўсю цішыню, каб не прапусьціць, не абмінуць аніводнага шораху, ні трэску замерзлай галінкі.

А сьлядоў колькі ў лесе, розных сьлядоў. І вялікія, і маленькія, разьбягаюцца ўва ўсе бакі па чыстым сьнягу і сплятаюцца ў сьнегавыя ўзоры, разыходзяцца пад навіслым гальлём, хаваюцца пад елкі і хвоі.

— Вунь заяц прабег, а то воўк сігануў ад дарогі, бач, на сажань скочыў... А тут, бач, цэлае вясельле прабегла, бач, абтаптаны сьнег каля хвоі...

Коні ідуць паволі, часам старожка натапырваюць вушы, порскаюць, калі ў змрочным гушчары трэсьне замарожаная галінка, ці мякка ўпадзе сьнежны камяк з абцяжаранае яліны.

Дзед Ігнат здымае свае паўпудовые сподкі, дастае капшук і ў хуткім часе на яго твары пачынаюць граць яскравыя водбліскі, а сам ён увесь хаваецца ў шэрых слупох даўкага дыму. Люлька дзеда смыліць ва-ўсю. А калі люлька гарыць, значыць дзед Ігнат нездменна што-небудзь ды скажа, такі ўжо дзедаў звычай.

— А мароз мацнее...

— Чаму-ж яму і не мацнець, яго-ж сьвята, піліпаўка.

— Яно так, піліпаўка. Н-но, гнядыя, варушэцеся, а то адубееце з холаду. Але хіба і разгорнішся тут. Дарога кепская, хоць-бы хутчэй выбрацца з гэтага воўчага логу.

— Чаму воўчы?—пытаю.

— А хіба я ведаю, так ужо людзі празвалі, дый апавядаць доўга—даўно было.

Вядома, дзед раскажа. Яму ня стрымацца, бо любіць стары пагаварыць, перэтрэсьці ў памяці мінулае, даўно пражытое. Але-ж трэба трохі пафанабэрыцца, звычайна гэта ўжо ў чалавечай натуры.

. . . .

— Ну, дык вось слухай. Жыў калісьці ў маёнтку нашым пан. Пан як пан і звычайная душа панская — жыў, гуляў, пеставаў паню. А пані была дзіўная. Ня то, што дзіўная, а ня проці ночы кажучы, шатан шатаном, з нячыстай сілай была ў вялікім сваяцтве. Але што гаварыць, сабой была вельмі прыгожая, і та-

кія вочы былі прыгожыя, што зірнеш у іх і холадна стане на сэрцы, нібы выпʻюць цудоўныя вочы тваю душу да дна і пакінуць пустэчу.

Адкуль узялася яна — ніхто ня ведаў. Казалі адны, нібы прывёз яе пан з-пад Турэччыны, другія казалі, што яна была з Вэнгрыі. Але толькі ніхто ня ведаў, дый няцікава гэта. Ведалі толькі, што вялікую сілу мае яна над панам, такую сілу, як ніхто. Ходзіць пан у яе на ланцужку. З намі грозны, а перад ёй ніжэй травы, цішэй вады. Так і пасьцілаецца лістом асеньнім, выпаўняе прыхамаці заморскай пані. Але дзе яму выпаўніць, стары быў ужо, недалужны.

Затое і былі заўсёды навальніцы ў панскіх пакоях. Вышчырыцца яна на яго, а ён толькі лыпае вачыма, трымціць, як асінавы ліст. Трымціць, трымціць, а злосьць спаганяе на парабкох ды на парабчанках.

Вось каму жыцьцё не за жыцьцё было, а адна пакута. І да чаго дапякаў іх пан, да чаго зьдзекваўся—утапіцца мала.

Але справа ня ў гэтым. Пачалося ўсё вось з чаго. Было ў пана сямёра парабкоў, адзін аднаго прыгажэй і здатней. Прыгожыя былі хлапцы, падабраў іх пан з усяе акругі, бач, клапаціўся, каб прыемна было вачом пані глядзець на іх—любіла яна ўва ўсім красу і здатнасьць. Але на сваю бяду панабіраў іх пан. Мусіць занадта чорныя вочы былі ў пані і занадта многа агню ў яе палкай крыві, толькі стала пані лашчыцца да хлапцоў. Ні то што лашчыцца, а так цёмнаю ноччу якой падбярэцца да таго, да другога, абаўе сілком рукамі за шыю, ды шэпча на вуха:

— Кахай мяне, будзеш вечна шчасьлівы, інача́й... пагібель...

А парабкі, вядома, хлапцы пужаныя, баяліся пана горш сьмерці, дый сама пані дзіўная—рабіліся вочы яе на сінія аганькі падобныя. Нібы тыя агні, што гарадь па начох на нашых балотах, па бяздонных, непралазных нетрах. Уцякалі хлапцы ад пані, баяліся духу яе, баяліся яе пацалункаў нячыстых, якія пяклі шатанскім агнём і высушвалі сэрца. І вялікая злосьць запанавала тады ў сэрцы пані. Яна паскардзілася старому пану, нібы парабкі хацелі ўзяць яе бела, як сьнег, цела, забрудзіць яе лебядзіныя грудзі, замуціць ясныя вочы векавечнаю ганьбаю.

Чаго толькі ня было тады. Цэлыя ночы сядзеў пан у сваім пакоі, думаў усё ды абдумваў, якую кару даць парабком за нячуванае іх злачынства. А хлапцоў пасадзіў у падзямельны склеп, панавешваў замкоў, варту прыставіў. Нібы хмары панавісалі тады над старым замкам, кожны абыходзіў яго, баяўся зірнуць на вокны, каб ня стрэць нячыстага зірку, не загубіць сваей душы.

А ў старым парку лёталі совы ўночы і круціліся кажаны паміж дрэў. Ды з цёмнага склепу вырываліся часам глухія стогны ды прыдушаны стук кайданаў.

І было раз у цёмную, цёмную восенскую ноч, калі ня відна ні зор, ні месяца, калі вые толькі вецер па лясох ды балотах, засьцілае вочы дажджовай мітульгою. Вышла пані з пакояў

у стары парк. Загудзеў ён нячуванымі галасамі, зашумелі векавыя ліпы абамшэлым гальлём, закруцілася пажоўклае лісьце — нібы нечысьць уся пазьляталася з усіх бакоў, павылазіла з сваіх патаемных нор і прышла да сваей гаспадыні.

Кажуць людзі, падышла да склепу пані, адамкнула замкі заржавелыя, пачала казаць замовы:

— Ня бачыць вам долі людзкой і людзкога шчасьця, ня ўзірацца ў блакітныя вочы дзявочыя. Вам радзіма-балота і глухія лясы, нагарода вам—воўчае сэрца. Бяжэце-ж ваўкамі шэрымі па нязнаных сьцежках лясных, шукайце шчасьця ваўчынага, шукайце долі сваей у хмызьняковых і непралазных нетрах...

І прабегла па цёмным парку сем шэрых ваўкоў, усе адзін у аднаго.

Даўно гэта было і аб парабкох ня стала ні слуху, ні духу, ні почату, нібы і ня было іх на сьвеце, нібы і ня былі яны ў нашым маёнтку.

— А прычым-жа тут воўчы лог?

— Эх, прыткія вы маладыя, вам адразу і падай усё ў рукі, адразу хочаце ўсё схапіць адным махам. Не, пачакай, дай давесьці ўсё па парадку... Бачыш, капліца стаіць, вунь, вунь, паза хвояй...

Сапраўды, на раскрыжаваньні дарог у самым непралазным гушчары стаяла невялічкая капліца і глядзела з-за хвоі сваімі цёмнымі, павыбіванымі вакенцамі. Гэтыя вакенцы, нібы запалыя мерцьвяковыя вочы, жудасна пазіралі з-пад навіслых лап старых ялін і разгацістых галін хвоі, што стаялі навокал, вартавалі пакой гэтай дзіўнай, нікому непатрэбнай будыніны. Каля капліцы стаяла некалькі струхнелых пахіленых крыжыкаў. На іх вісела, страціўшы свой колер і выгляд, некалькі выпетраных ветрам і нягодаю хвартушкоў. Хто іх вешаў, хто вышываў рупліваю рукой выцьвелыя пад сонцам і сіверам узоры, чые падзеі ўкладаліся ў гэтыя „божыя ручнікі“ — мусіць, ведаць толькі старым хвоям, ды старым ялінам. Наўкола была сумная цішыня, цішыня старога немярэчча, дзе ні песьняў, ні радасьці, ні вясёлага гоману-шуму.

Мярцьвячына, цьвіль...

— Дык вось... Справа была ў піліпаўку. Кажуць людзі, завеі былі вялікія, трашчалі маразы лютыя, ніхто ў дарогу ня ехаў, сядзелі па хатах. Надыходзілі каляды. Паехаў пан з паняю ў горад. Ні то ў госьці, ні то так куды, адным словам, панскія справы. Ноч у той час была асаблівая, такая замець узьнялася, што суседняй хаты ня ўбачыш, ня толькі што. Навалілa замець такія гурбы, што з канём утапіцца можна.

І праходзіць дзень, праходзіць другі, ня чуваць ні пана, ні пані. Прайшло колькі дзён і зьвярнуўся ў маёнтак фурман панскі. Дзіўны зьвярнуўся — ні слова ад яго не пачулі людзі талковага, такое верз — няма ведама што. Звар‘яцеў хлапец. Толькі і разабраць можна было—ваўкі шэрыя, шэрыя... а вочы—сьвечкі, ды вострыя зубы...

А ў хуткім часе знайшлі і пана. Ня пана, а косьці яго пад старою хвояй. А пані і сьлед прастыў і ніхто ня бачыў яе з таго часу, ня чуў аб ёй і ня ведаў. Праўда, знайшлі пастушкі пярсьцёнак залаты з дыямэнтам — усё, што засталося ад пані. Прынесьлі ў вёску яго, паказалі ўсім. Цудоўны персьцень, так і гарыць агнём яго камень чырвоны. Але ўсе, хто толькі глядзеў на гэты персьцень, нудзіліся потым, на сэрца сохлі. І казалі яшчэ, калі паглядзець на персьцень апоўначы — убачыш страшныя вочы пані ў дыямэнце цудоўным. Але ніхто не глядзеў, баяліся, бо толькі надыйдзе цёмная ноч, ды разгуляецца ў полі віхура, падыходзяць пад вокны шэрыя ваўкі, вышчэрваюць зубы, уныпяць вочы свае агнявыя ў няшчасную хату, дзе ляжаў пярсьцёнак, ды як завыюць, завыюць, ніхто ў сьвеце такога выцьця ня чуў.

Кінулі потым персьцень у гэта балота, закінулі ў непралазную дрыгву, каб не спакушалася чалавечае сэрца на страшны блеск дыямэнту. І вось балота, дзе было гэта ўсё, і празвалі воўчым логам, а на месцы тым, дзе загінуў пан, сваякі яго капліцу паставілі. Сказаць паміж намі — непакойнае месца тут, ня к ночы кажучы: прытулак усяго нячыстага. Колькі раз траляліся нашы людзі на нядобрыя здарэньні каля капліцы, то сядзіць на хвоі белая здань, то плача нібы хто, ці скаголіць у капліцы, то гоніцца нібы хто страшэнны, цудоўны за падарожным, ці за праежджым, асабліва калі ідзеш ці едзеш адзін, сам-на-сам.

Дзесьці далёка, далёка, вярсты за тры, за чатыры завыў у адзіноце воўк. Выцьцё было ціхае, працяглае, поўнае нейкай нявыразнай жудасьці, безнадзейнасьці.

Праз хвіліну раздалося другое выцьцё больш грубое, больш гучнае, дзесьці бліжэй... А там трэцяе, чацьвертае, пятае, і хутка жудасны канцэрт апанаваў усім лесам, перапоўніў яго страхам і жудасьцю. Коні пужліва заматалі галовамі, натапырылі вушы. Дзед Ігнат прыціх адразу, скорчыўся ў камячок на сваіх развалках, перахрысьціўся і пужліва пачаў падганяць коняй. Ён спалохана, няўпэўнена махаў пужкай і ціха, але настойліва занукаў:

— Н-но... но... Чаго прысталі... Хутчэй дома будзем...

І толькі праз хвіліну, прыслухаўшыся да лясных гукаў, Ігнат гаварыў ужо весялей:

— Мусіць, пайшлі мохавым балотам, цяпер ужо далёка, каля самых паплаваў будуць. Дый лепей... ну іх, ня варта з імі ў дарозе сустракацца, лепш далей ад грэху...

Лес станавіўся радзей і радзей, хутка выехалі на чыстае поле і ў перадзе зазьзялі дыямэнтамі-зоркамі яскравыя аганькі. То сьвяціліся электрычныя лямпачкі заблытанай сярод лясоў і балот гуты.

Недалёка ўжо было і да гэтых лямпачак, але ўсё навокал прыняло на сябе другое адценьне, другі характар. Зьніклі спалахі лесу, адпачывала вуха ад настарожанае цішыні, напружа-

ныя шолахі ночы зьніклі з усёй сваёй фантастыкай, чароўнай таемнасьцю. І камень-самацьвет, семера шэрых ваўкоў, і белыя здані пад абамшэлай капліцай—усё гэта адразу згінула, засталося дзесьці далёка-далёка з-заду, засталося прыгожаю казкай, усхваляваўшы на хвіліну выабражэньне.

Нават зьмяніўся сам Ігнат. Ён загаварыў пра рабочых, пра гуту.

— Бач, сьветла як. Хіба было так за панам—была гута калісьці панскай. Куды там, было цёмна, хоць вока выкалі. А цяпер, ого!..

І Ігнат пачаў расказваць, як жыве яго сын на заводзе, як распальвае ён страшэнныя печы...

— Мо' страшней дыямэнту і шэрых ваўкоў? Камень тут ні прычым... Што і гаварыць... Камень там — у лесе, у балоце, вунь, у нетрах у тых, дзе гарэць па начох сінія аганькі... А тут, ды што казаць... Н-но, гняды, варушыся!..

Палазы заскрыпелі гучней, дзед прысьвіснуў на коней, і сані паімчаліся віхрам па крыштальнай, наежджанай дарозе.

АД. СТАНКЕВІЧ.

Прафэсар Браніслаў Эпімах-Шыпіла.

(*З яго жыцьця і працы*) *).

Сапраўды ў дзіўных жывём часох—аб сьмерці найлепшых сыноў Беларусі, памёршых на ня так ужо й далёкай чужыне, даведваемся толькі за якога паўгоду. Вось толькі некалькі месяцаў таму дайшла ў Вільню сумная вестка з над берагоў Нявы аб сьмерці ў хмарным Ленінградзе вялікага і заслужанага Беларуса, высокадастойнага чалавека, прафэсара Браніслава Эпімах-Шыпілы.

На жаль, аб Шыпіле ня маю столькі вестак, колькі мець іх трэба для адмаляваньня поўнага абраза ягонай асобы. Сабраць належныя аб ім весткі можна было-б прадусім там, дзе ён жыў і працаваў: у Ленінградзе і ў Савецкай Беларусі. Тымчасам на перашкодзе гэтаму стаіць ня толькі граніца палітычная, якая дзеліць Беларусь, але так-жа і граніца ідэёвая, якая дзеліць беларускія душы. Але справа і з гэтым не безнадзейная—час сваё зробіць і направіць, будучыня згладзіць, зраўняе няроўнасьці, направіць памылкі і недахопы мінуўшчыны.

Цяпер-жа я зрабіў тое, што змог; дзялюся з грамадзянствам тымі весткамі аб Шыпіле, якія захаваліся ў маей памяці з часоў асабістага майго з ім спатыканьня і знаёмства, а так-жа тымі весткамі, якія мне ўдалося сабраць з літаратуры і ад ягоных знаёмых.

Тым усім асобам, якія дапамаглі мне ў зьбіраньні гэтых вестак аб праф. Шыпіле, як гр. гр.: Сталыгва, Кс. В. Гадлеўскі, М. Пяцюкевіч, Адв. Будзька, інж. Л. Дубейкаўскі, Кс. В. Шутовіч, Ян Шутовіч, д-р Т. Грыб, а так-жа д-р Я. Станкевіч, які даставіў фатаграфію памёршага прафэсара, — на гэтым месцы выражаю шчырую падзяку.

* * *

Сьветлай памяці праф. Браніслаў, сын Ігната, памёр 6 чэрвеня сёл. 1934 г., дажыўшы да старэчых паважных 75-х гадоў. Радзіўся ў канцы першага дзесятку другой паловы мінулага 19-га стагодзьдзя—4 верасьня 1859 г. у хвальварку Будзькаўшчына, Лепальскага пав., Віцебскай губэрні.

Дату і месца яго раджэньня ўдалося ўстанавіць на падставе савецкіх літаратурных крыніц, у аднэй з якіх (Наука и научные работники СССР ч. IV. Ленинград, 1928 г., бач. 503) чытаем даслоўна: „Бронислав Игнатьевич Эпимах-Шыпилло: действительный член Института Белорусской Культуры; директор Словарной Комиссіи по составленію академическаго словаря живого бело-

*) Рэфэрат чытаны на жалобнай акадэміі, ладжанай Бел. Інст. Гасп. і Культ. у Вільні 8/XII 1934 г.

русского языка при Институте; классическая филологія, лингвистика; белорусскій язык; составленіе словарей белорусского языка (4.IX. 59. усадьба Будьковщина, Лепальск. у. Витебск. г.)".

Бацькі Шыпілы, пасьля нараджэньня Браніслава, хутка апынуліся ў іншым хвальварку Залесьсе, таго-ж Лепальскага пав., недалёка ад Полацку. Відаць гэта з таго, што малодшы на пяць гадоў брат яго Ўладыслаў, аб якім будзе зацемка ніжэй, ужо радзіўся ў Залесьсі („Лучынка", кн. 6, 1913 г.). Вось-жа тут праводзіў сваю моладасьць і малады Браніслаў. Паходзіў з дробнай каталіцкай беларускай шляхты, якая хоць пры помачы польскага касьцёла была сыстэматычна і безаглядна польшчана, усёждыкі аканчальна ня спольшчылася і агулам захавала сваю родную беларускую мову, а так-жа й лепшыя традыцыі беларускай мінуўшчыны. Вось у такой сямейнай атмасфэры і сярод толькі-што прабіраючагася з паншчыны на волю беларускага сялянства рос і гадаваўся малады Шыпіла. Гімназію мусіў скончыць або ў Рызе, дзе яе канчаў яго брат Уладыслаў („Лучынка", там-жа), або ў недалёкім Віцебску. Вышэйшыя навукі прайшоў у Пецярбурзе, дзе скончыў гістарычна-філёлёгічны Інстытут, на аддзеле клясыкі. Быў выдатным моваведам, знаў больш 20-х моваў, між якімі прадусім стара-грэцкую, лацінскую, індускі санскрыт і цэлы рад моваў розных народаў сучасных.

Беларускай нацыянальнай сьведамасьці Шыпілы, як ужо сказана, спрыяў беларускі асяродак, у якім ён гадаваўся, а перадусім гэтай справе спрыялі мовазнаўчыя студыі. Дзякуючы гэтаму, ужо за сваіх часоў студэнскіх цікавіўся ён праблемай беларускай нацыянальнасьці, мовы, гісторыі і быў фактычна сьведамым Беларусам. Няменш урэшце дадатна дзеіў на фармаваньне ў Шыпілы беларускага нацыянальнага сьветапагляду і той час, у якім ён адбываў свае навуковыя студыі. Не забываймася, што былі гэта 70—80-ыя гады мінулага стагодзьдзя, гады пачаткаў адраджэньня народу украінскага, літоўскага, латыскага і інш. народаў-нявольнікаў царскай Расеі, — гады вызвольнай працы палякоў і народавольскіх імкненьняў самых-жа расейцаў.

Дарэчы тут адзначыць, што Шыпіла, будучы ў пачатку нашага стагодзьдзя прафэсарам у Р-К Дух. Акадэміі ў Пецярбурзе праз некаторы час працаваў разам з кс. праф. Яўнісам, ведамым літвіном філёлёгам, які паддзержаваў літоўскі нацыянальны рух сярод літоўцаў акадэмікаў і спрыяў беларусам.

Цэнтрам гэтых рухаў быў перадусім сталічны Пецярбург, асяродкам-жа гэтых розных народаў імкненьняў была перадусім студэнская моладзь. Першыя расткі беларускага романтызму, як культурнага, навуковага, так і палітычнага, Шыпіле ня былі няведамы. За часоў дасьпелай моладасьці Шыпілы жывымі яшчэ былі традыцыі творчай працы на беларускай ніве Баршчэўскага, Рыпінскага, Чэчата, Дунін-Марцінкевіча і інш., а так-жа й палітычныя натугі К. Каліноўскага. Многае-ж узноў з праяваў беларускага жыцьця бачыў Шыпіла яшчэ за часоў моладасьці і сва-

імі уласнымі вачыма. На яго, можна сказаць, вачох адбылася сьмяротная трагедыя цара Аляксандра II, паўшага з рук беларускага народавольца Ігната Грынявіцкага; знаўся Шыпіла і нават у блізкіх быў адносінах з Фр. Багушэвічам, тварцом беларускай нацыянальнай ідэолёгіі, знаўся так-жа з вучоным сабіральнікам памятак беларускай мінуўшчыны Сапуновым, з вялікім прыяцелем беларускага народу Ал. Ельскім і інш. прадстаўнікамі беларускага романтызму, пачынальнікамі беларускага нацыянальнага адраджэньня.

За часоў так-жа дасьпелай моладасьці Шыпілы рабіліся між іншым спробы русыфікацыі Беларусаў каталікоў і праз каталіцкі касьцёл, у які ў тыя-ж 70—80-ыя гады мінулага стагодзьдзя царская палітыка намагалася ўвесьці расейскую мову. Усё гэта разам узятае, чаго ці праз жывую яшчэ традыцыю ці чаго сам асабіста Шыпіла быў сьведкам, угрунтоўвала і ўцьвярджала яго ў правільнасьці і неабходнай патрэбнасьці нацыянальнага адраджэньня беларускага народу. Вось-жа гэтай справе, цалком адрокшыся асабістага жыцьця і асабістага шчасьця, Шыпіла ўсёцэла і пасьвяціў сябе.

Беларуская і агулам грамадзкая і навуковая дзейнасьць прафэсара Браніслава Ігнатавіча Шыпілы відацца ўжо вось з гэткіх яго тытулаў: Лектар грэцкай мовы ў Імпэратарскай рымска-каталіцкай Духоўнай Акадэміі, Памоцнік бібліятэкара Імпэратарскага Пецярбурскага Унівэрсытэту, Лектар лацінскай мовы на вячэрніх агульна-навуковых курсах для дарослых А. С. Чарняева, Вучыцель гімназіі для хлапцоў пры касьцеле сьв. Кацярыны, Чынны сябра Віцебскай навуковай Архіўнай Камісіі, Сябра Інстытуту Беларускай Культуры і пазьней сябра Беларускай Акадэміі Навук у Менску.

* * *

Праца Шыпілы дзеліцца на два пэрыяды: на дарэвалюцыйны і парэвалюцыйны. Зачнём з першага.

Бліжэй апісваючы беларускую дарэвалюцыйную працу Шыпілы, трэба зазначыць, што ішла яна перадусім у трох кірунках: сабіраньне кніжак і агулам культурных памятак беларускай мінуўшчыны, гадаваньне, арганізаваньне і ўсьведамляньне беларускай моладзі і ўрэшце арганізаваньне беларускай культурнай, перадусім выдавецкай працы.

1. У скромнай сваей кватэры ў Пецярбурзе (4 лінія 45—16) грамадзіў Шыпіла рэдкія беларускія, або беларускай справы датычныя, рукапісы, кніжкі і іншыя забыткі. Пазнаць-жа гэтыя беларускія культурныя цэннасьці апрача сваіх студыяў, меў ён магчымасьць будучы дзейным сябрам Архіўнай Камісіі ў Віцебску, ад імя якой у 90-х гадох езьдзіў на Архэолёгічны З'езд у Рыгу, а так-жа спаўняючы абавязкі дырэктара Імпэратарскай Пецярбурскай Бібліятэкі. Праўда, афіцыяльна ён лічыўся „памоцнікам бібліятэкара“ — гэта знача памоцнікам дырэктара, але

фактычна быў ён дырэктарам, якім афіцыяльна быць ня мог з прычыны свайго каталіцкага веравызнаньня.

Зьбіраючы беларускія культурныя забыткі, у Шыпілы паўстала думка стварэньня з іх як-бы беларускага нацыянальнага музэю, які паводле яго думкі меў памяшчацца ў родным фальварку Залесьсі, паложаным, як ужо ўспомнена, блізка гістарычнага беларускага цэнтру Полацку. Думка гэта ў яго ня была пустой. Ён зусім паважна думаў рэалізаваць яе. Дзеля гэтай мэты ў Залесьсі ўжо нават быў збудаваны дом, у якім з цэнных беларускіх забыткаў ужо сёе-тое было памешчана. На няшчасьце аднак дом гэны згарэў і надта магчыма — аб чым пэўнасьці ня маем—не адна згарэла з ім і цэнная беларуская рэч. Дзякуючы Шыпіле, перайшоў беларускаму народу ў спадку не адзін цэнны забытак.

І так, як падае Карскі (Карскій,—Бѣлоруссы III, 3, бач. 61, 74, 76) у Шыпілы аказалася: добрая копія, зроблена з арыгіналу ў Ал. Ельскага „Залётаў“ Марцінкевіча з 1870 г., а так-жа рукапісны зборнік беларускіх вершаў, які сабраў той-жа Шыпіла ў 1889 г. У склад гэтага зборніку ўваходзяць вершы розных беларускіх, пераважна нязнаных, поэтаў. Між імі ёсьць вершы Фэлікса Тапчэўскага (Фэлька з Рукшэня), шляхціца з Лепальшчыны, якія Шыпіла перапісаў з орыгіналу. У тым-жа зборніку Шыпілы спатыкаем адзін беларускі верш, які прыпісваюць Яхіму Тамашэвічу. У Шыпілы так-жа знаходзілася ў рукапісе „Беларуская Скрыпачка“—Фр. Багушэвіча.

Дужа цэнную і вялікую бібліятэку, зьбіраную праз доўгія гады, праф. Шыпіла перадаў у бібліятэку Беларускай Акадэміі Навук у Менску. Вось што аб гэтым чытаем у „Полымі“ з 1929 г.

„Проф. Эп.-Шыпіла перадаў Бел. Ак. Навук сваю бібліятэку, якую ён зьбіраў на працягу 40 гадоў. Бібліятэка складаецца з 5.000 кніг розных назоваў. Бібліятэка будзе зьмешчана ў асобным пакоі і будзе складзены асобны каталёг“ („Полымя“, чэрвень, 1929 г., бач. 217).

Гэтак пісаў савецкі часапіс на пярэдадні вялікага паходу Саветаў на беларускую культуру і на яе творцоў. Дык трудна спадзявацца, каб гэны намер што да бібліятэкі Шыпілы ды быў сяньня споўнены. Астаецца толькі пацяшацца думкай, што беларускі культурны скарб, сабраны Шыпілай, знаходзіцца ў бібліятэцы Бел. Акадэміі Навук і што нічога яму не пагражае.

2. Другой галінай беларускай працы Шыпілы, як ужо ўспомнена, была беларуская моладзь. Моладзь любіў ён шчыра і ад усей душы. Сам будучы бязжэнным, усё сваё лепшае—і духовае і матар'яльнае—пасьвяціў моладзі. З натуры добры, шчыры, чулы, высока этычны, стаўся праўдзівым апякуном і бацькам моладзі, якой ён памагаў духова і матар'яльна. Сколькі разоў прыходзілася мне асабіста бываць у Шыпілы, заўсёды я спатыкаў там беларускіх студэнтаў, якія прыходзілі да яго ў розных справах ідэёвых і навуковых, а так-жа многія часта і для

Прафэсар БРАНІСЛАЎ ЭПІМАХ-ШЫПІЛА
(4.IX.1859 — 6.VI.1934).

таго, каб выпіць гарбаты, паабедаць ды рубля якога дастаць гатоўкай. Асаблівым разьвясяленьнем маладых гасьцей Шыпілы быў грамафон, які з беларускай пліты бойка высьпевываў „Чаму-ж мне ня пець“... Заводзіў Шыпіла гэты грамафон пераважна тады, калі прыходзілі да яго новыя студэнты. Помню, як ён і мяне спатыкаў з гэным грамафонам.

Пад Шыпілы кіраўніцтвам, а прынамсі пры яго жывым учасьніцтве, адбывала студэнская моладзь розныя ідэёвыя зборкі, нарады, лекцыі, ладзіла аматарскія тэатры.

Працу сваю над беларускай моладзяй праводзіў Шыпіла ў двух кірунках — у кірунку беларускай студэнскай моладзі духоўнай і сьвецкай. Спрыялі гэтаму, як ня трэба лепш, тыя навуковыя становішчы, якія Шыпіла займаў: лектарат грэцкай мовы з 1902 г. у Дух. Акадэміі, пасьля фактычнае дырэктарства ўнівэрсытэцкай бібліятэкі і лектарат лацінскай мовы на агульна навуковых курсах Чэрняева. На гэтых курсах гадаваў ён між іншым і вялікага беларускага паэта Янку Купалу.

Гэтыя становішчы далі Шыпіле вялікую магчымасьць зблізіцца з беларускай студэнскай моладзьдзю, як сьвецкай, так і духоўнай, гуртаваць яе і павесьці сярод яе шырокае народнае ўсьведамленьне. Найбольш любым спосабам ягонай у гэтым кірунку працы, апрача жывога слова і ўласнага прыкладу, была кніжка.—А вось прачытайце, дужа цікавая рэч—казаў ён студэнту, падносячы яму навуковую кніжку аб Беларусі.

Сапраўды, Шыпілу бяз кніжкі трудна сабе й прадставіць. Як жывы стаіць ён мне ў ваччу на калідорах і ў салях Духоўнай Акадэміі даслоўна з бярэмям кніжак, якія прыносіў нам сам паводле сваей уласнай волі і на нашу просьбу. Цікавыя і часта рэдкія былі гэта кніжкі, якія ён даставаў ня толькі з Бібліятэкі Унівэрсытэцкай, але з Акадэміі Навук, з Бібліятэкі Публічнай і з прыватных збораў сваіх уласных і іншых.

Так у беларускай усьведамляючай сярод студэнства працы Шыпілы кніжка была апошнім доказам. Пазволю тут сабе расказаць наступны ўспамін. Будучы яшчэ ў Віленскай Духоўнай Сэмінарыі, калі аб Шыпіле нічога я і ня чуў і ня знаў, бліжэй я зжыўся з клерыкам, які называўся Вінцэнты Рыжы. Прыбыў ён да нас у сэмінарыю нешта з трэцяга курсу матэматыкі Пецярбурскага Унівэрсытэту. Дружба мая й прыязьнь з Рыжым была-б сапраўды поўнай, каб не адна „дробная“ рэч—ён лічыў сябе стопрацэнтным паляком, а я сябе гэталькіх працэнтаў беларусам. Разумеецца, былі ў гэтай справе частыя, часам дужа доўгія і гарачыя спрэчкі, у якіх я з усіх сіл нераз стараўся праканаць Рыжага, што і ён беларус, аб чым між іншым мела сьведчыць і тое, што паходзіў ён з Віцебшчыны. На гэта мне раз казаў Рыжы:—Ды адчапіся, усё роўна ты мяне не пераканаеш, мяне ня гэткія пераконвалі і то нічога; за мной у ўнівэрсытэце проста па пятах хадзіў Шыпіла, даказваючы, што я беларус, а калі я аставаўся пры сваей польскасьці, ён на разь-

вітаньне звычайна торкаў мне якую кніжку аб беларусах і казаў: а ўсёждыкі прачытайце, цікавая рэч, пераканаецеся! Але ўсё гэта Шыпіла рабіў дужа асьцярожна і далікатна, ня так, як ты— канчаў Рыжы свой зусім прыпадковы ўспамін аб Шыпіле.

Вынік такой працы прафэсара Шыпілы быў той, што многія сяньняшнія выдатныя беларусы—яшчэ жывыя і ўжо памёршыя, —як Я. Купала, Тарашкевіч, Жылуновіч (Цішка Гартны), Душэўскі, Грыб, Заяц, Варонка, кс. кс. Лісоўскі, Грынкевіч, Будзька, Абрантовіч, Гадлеўскі, Хвецька, Станкевіч, Цікота, Шутовіч, Лупіновіч, Хоміч і інш. гэта ў большай або ў меншай меры ўсё ягоныя духовыя дзеці.

Але Шыпіла меў беларускае значэньне ня толькі сярод моладзі, з якой беспасрэдна стыкаўся, без яго ў беларускіх культурных і навуковых справах не абыходзіліся часта і беларусы старэйшыя, ужо працуючыя на беларускай ніве, асабіста з ім нават незнаёмыя. Вось напр. Цётка, ведамая беларуская паэтка і пісьменьніца, культурная дзеячка і народная рэволюцыянерка, будучы ў 1906 г. на эміграцыі ў Львове, піша да Шыпілы гэтак: „Wybaczajcie, szto nieznajomaja i piszu da Was, Ja Paszkiewiczanka, Wam aba mnie kazaŭ Iwanoŭski, bo to kaliś prabawała wierszy pisać i ich Wam czytali, Woto-ż ciapier żywu ja u Lwowi, z ukraincami-rusinami i unijatami zawadżu znakomstwa. Szmat nam spryjajuć, pamohuć u czym siła. Ciapier poki szto budуć drukawać pa biełarusku. Kali majecie szto, to pryszlecie. Ja chaczu dawiedacca ad Was, szto czutno z bukwarom, ci ŭżo hatoŭ, ci u nas budzie fonetyka nasza biełaruska. Heta wielma ważna, bo budu ciapier wydawać papularnyja reczy dla narodu dy nia wiedaju jak czaho trymacca. Skora wyszlu kniżki ab unji dla akademikaŭ duchoŭnych na Wasz adrys dla Budźki. Wy, szanoŭny prafesar zakińcie pierad imi słowa za uniju, bo jany Was wielmi szanujuć i paważajuć"... (Ю. Бібіла—Матар'ялы да біографіі Цёткі. Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук Інст. Бел. Культуры, Кн. 2, т. 1, бач. 296).

Быў урэшце Шыпіла так-жа й душой беларускіх работнікаў, сярод якіх шырока праводзіў народна-культурную працу і якія яго дужа любілі і паважалі.

Да рэчы будзе ўрэшце адзначыць, што беларускую працу сярод моладзі Шыпіла праводзіў ня толькі сам, але яму памагаў у гэтым асабліва ў галіне сцэнічнай ягоны малодшы брат Уладыслаў, які вучыўся ўсваім часе ў Пецярбурскім унівэрсытэце на фізыка-матэматычным факультэце, пасьля быў чыноўнікам у Міністэрстве Фінансаў і памёр 6 траўня 1913 г. Вось што аб гэтым піша „Лучынка", літаратурна-навуковы месячнік беларускай моладзі (1913 г., шостая кніжка):

„Праца дзеля куска хлеба адарвала яго (Уладыслава—А. С.) ад роднай старонкі на змаганьне з жыцьцём сярод чужых, але нябошчык цэлае жыцьцё шчырай душой рваўся да працы для сваей роднай бацькаўшчыны і чым мог стараўся прылажыцца

да будовы яе сьвятлейшай будучыны. Жыцьцё яго суцэльна вяжыцца з жыцьцём пецярбурскай студэнскай моладзі, перадусім з яе працай на беларускай сцэне. Калі ў 1905 г. усё, што жыло, варам закіпела, пецярбурскія студэнты пачалі гуртавацца і думаць аб працы для свайго гаротнага народу. Зразумеўшы добра, як вялікае маюць значэньне роднае слова і родная песьня, яны пачалі ладзіць вечарніцы—ігрышчы з беларускай сцэнай. Тут іх правадыром, загадчыкам і разам першым таварышам быў сьветлай памяці Уладыслаў. Яго рупнасьць і маладая ахвота зьдзівіла куды ад яго маладзейшых. Заняты службай, сям'ёй ён умеў аднолька-ж урваць крыху часу і для сцэны, дзе ён быў душой кожнага беларускага прадстаўленьня. Вучыў другіх і сам іграў з вялікім зразуменьнем беларускага жыцьця і таго, якое значэньне мае роднае слова. У працягу колькі год пры яго помачы былі пастаўлены на сцэне беларускія тэатральныя творы: „У зімовы вечар“, „Па рэвізыі“, „Пашыліся ў дурні“, „Міхалка“, „Паўлінка“, „Хам“ і др. У кожным творы ён умеў зрабіць жывы тып і сваёй чыстай і зычнай гутаркай цешыў сэрцы беларусаў спрагнёных роднага слова, дарагога зыку ў чужой, сумнай і пахмурнай старане“.

Беларуская стыхія, як бачым, жыла ня толькі ў душы Браніслава Шыпілы, але жыла яна так-жа і ў душы яго брата Уладыслава, а гэта пазваляе думаць, што стыхію гэту яны вынесьлі ў сьвет шырокі ад бацькоў і дзядоў сваіх.

3. Але беларускую піонэрскую сваю працу праф. Шыпіла вёў ня толькі зьбіраючы беларускія культурныя забыткі, ня толькі гадуючы беларускую моладзь, але так-жа ўмеў ён гэтую працу праводзіць больш плянова і арганізацыйна, разьлічваючы яе на далейшую мэту, на большую трываласьць. Гэткай працай было, наладжанае ім беларускае выдавецтва.

У 1906 г. у тым-жа Пецярбурзе паўстала беларуская выдавецкая супалка „Загляне сонца ў наша ваконца“ *). Мэтай гэтай супалкі, як гаворыцца ў яе статуце, было: „Выдаваць і пашыраць выданьні беларускія і ўсё, што стыкаецца з жыцьцём Беларусі“. Да супалкі гэтай належылі старыя беларускія дзеячы: цяперашні праф. Варшаўскай Політэхнікі В. Іваноўскі, Ант. Трэпка, В. Сталыгва, А. Грыневіч і інш., аднак душой яе быў праф. Шыпіла. Супалка мясьцілася ў ягонай кватэры і ён перадусім рупіўся аб яе дзейнасьці.

Супалка гэта пратрывала да 1913 году. Для беларускай нацыянальнай сьведамасьці і для беларускай культуры, як на пачаткі, даканала яна дужа многа. За ўвесь час свайго шасьцігодняга існаваньня выдала яна 22 беларускія кніжкі, зьместу агульна прасьветнага, сцэнічнага і літаратурнага, а ў ліку гэтых апошніх і большасьць твораў бацькі беларускай прыгожай літарату-

*) Выд. супалка „Загляне сонца і ў наша ваконца“ заложана 13.V. 1906 г.; узноўлена была 30.IV. 1909 г. („Наша Ніва“ 1909 г., № 43).

ры В. Марцінкевіча. Гэта-ж супалка ў тым-жа Пецярбурзе ад 1912 г. выдавала беларускі літаратурна-навуковы часапіс—„Маладая Беларусь“, які, з бліжэй няведамых прычын, спыніўся ў 1913 г. Часапіс гэты выходзіў непэрыядычна, у меру таго, як быў назьбіраны матар'ял. Усяго „Маладой Беларусі“ вышла тры сшыткі па 160 бачын вялікай васьмёркі кожны.

* * *

Пасьвяцім цяпер колькі ўваг працы і жыцьцю праф. Шыпілы ў другі, парэволюцыйны, пэрыяд яго жыцьця.

Яшчэ падчас вайны, астаючыся на старых сваіх становішчах, Шыпіла, хоць ужо не ў такіх разьмерах, праводзіў яшчэ сваю звычайную беларускую працу. Варункі-ж гэтай працы цалком зьмяніліся і сталіся немагчыма цяжкімі з надыходам і паглыбленьнем вялікай расейскай рэвалюцыі і асабліва рэвалюцыі бальшавіцкай. Дык цалком зразумела, што праца Шыпілы ў міжчасе 1918—1925 г. спыняецца. Праўда прабываў Шыпіла ў гэтым часе і далей пераважна ў Ленінградзе і далей стараўся праводзіць беларускую працу, але магчымасьці гэтай працы ўжо былі невялікія, а часта й ніякія. Цярпеў у гэтым часе ў Ленінградзе Шыпіла дужа многа і што не памёр з голаду яшчэ тады, гэта заслуга беларускага работніцтва, якое рупліва ім апякавалася. Наагул у гэтым часе аб Шыпіле было ціха і глуха.

Беларускае грамадзянства ізноў даведалася аб сваім нацыянальным павадыры ў 1925 г., калі ў сталіцы Беларусі Менску ў Інстытуце Беларускай Культуры наладжваліся сякія-такія магчымасьці больш-менш нармальнай навуковай працы.

У Гэтым 1925 г., калі Шыпіла прабываў тады яшчэ ў Ленінградзе, Народны Камісар Асьветы БССР—між многімі іншымі—назначыў яго на сапраўднага сябру Інбелкульту ў Менску.

У тым-жа часе Соўнарком БССР проф. Бр. Эпімах-Шыпіле вызначыў пачэсную пэнсію.

Пасьля гэтага Шыпіла з Ленінграду прыбыў у Менск і прыступіў да навуковай працы ў Інбелкульце. („Полымя“ № 1, 1925 г., бач. 182 і 183, а так-жа № 3, бач. 167).

Сьляды яго працы ў Інбелкульце ўдалося мне напаткаць гэткія. У працах Інбелкульту: Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук (Кніга 2, т. I, бач. 377—380) з 1928 г. спатыкаем грунтоўную мовазнаўчую рэцэнзію Шыпілы на этнографічны зборнік Сержпутоўскага: „Казкі і апавяданьні беларусаў з Слуцкага павету“.

У тым-жа 1928 г. у кастрычніку месяцы, Інбелкульт ператвараецца ў Беларускую Акадэмію Навук. У сувязі з гэтым гістарычным фактам у гісторыі культуры беларускага народу, на бачынах „Савецкай Беларусі“ (з дня 16 кастрычніка 1928 г.) спатыкаем наступную зацемку: „Няхай жыве маяк беларускай культуры. Для Савецкай Беларусі ўтварэньне Беларускай Акадэміі

Навук зьяўляецца бязьмерным шчасьцем. Гэта зьяўляецца актам вялікага гістарычнага значэньня на шляху стварэньня беларускае культуры.

Уся працоўная Беларусь павінна быць удзячна ўраду БССР за перайменаваньне Інбелкульту ў Беларускую Акадэмію Навук. Гэты акт робіць беларускую культуру больш вядомай за межамі. Гэта таксама дасьць магчымасьць больш глыбока і шырока разгарнуць працу па вывучэньні ўсіх патэнцыяльных сіл Беларусі.

Беларуская Акадэмія Навук стане пуцяводнай зоркай для ўсяго беларускага народу. Яна будзе сьвяціць яскравым агеньком і для тае часткі Беларусі, якая зараз ня можа прыняць удзелу ў будаўніцтве беларускай культуры, што шырока разгарнулася ў Савецкай Беларусі.

Няхай рунее Беларуская Акадэмія Навук, як маяк беларускай культуры! Праф. Б. І. Эпімах-Шыпіла".

Далей, з 1929 г. спатыкаем выданы ў Менску ўжо Беларускай Акадэміяй Навук „Краёвы Слоўнік Чэрвеншчыны", (гэта мае значыць—Ігумэншчыны), М. Шатэрніка, пад рэдакцыяй М. Я. Байкава і Б. І. Эпімах-Шыпілы.

*
* *

Але, як ведаем, вясна беларускай культуры ў Савецкай Беларусі трывала нядоўга. Хутка на зьмену ей, мінаючы цалком лета, прышла панурая восень і сьцюдзёная зіма. Маю на ўвеце, як лёгка дагадацца, тую барацьбу маскоўскага III камуністычнага інтэрнацыяналу, які апошнімі гадамі, у імя бліжэй неакрэсьленага шчасьця працоўных, павёў жорсткую фанатычна-сэкцярскую барацьбу проціў беларускага народу, як нацыі і, што з гэтага вынікае — проціў усіх тых творчых праяваў: культурных, эканамічных і грамадзка-палітычных, якія гэтую беларускую нацыю ўгрунтоўваюць.

Вось-жа гэта хваля нішчэньня бальшавікамі беларускага народу ня мінула і праф. Шыпілы, як народу гэтага вернага сына, піонэра яго адраджэньня і гарачага патрыёта.

У рукі мае трапіла пісулька, пісаная ў гэтым часе Шыпілам ужо з Ленінграду, да ведамага беларускага дзеяча Кс. Віктара Шутовіча, які цяпер прабывае, як прывыклі мы называць, у „польскай Сібіры"—ў Хорашчы за Беластокам, а які, за сваю беларускую працу духоўнай уладай пазбаўлены парахвіі, апынуўся тады аж у Злуч. Станах Амэрыкі. Пісулька гэна вымоўна і трагічна малюе апошнія гады жыцьця дастойнага праф. Шыпілы. Вось даслоўны зьмест гэнага дакуманту: „Ленінград, 1-га лістапада 1930 г. Паважаны Земляча! Вельмі даўно ўжо ня меў я ад Вас ані якай весткі, ды й сам я даўно ўжо ня пісаў да Вас. А здарылася гэта з незалежнай ад мяне прычыны. Прошлым летам спаткала нашу А... (Акадэмію—А. С.) вялікая бяда, ад каторай уцярпеў і я. 19-га ліпеня пасьля вобыску, у часе каторага былі забраны Вашы лісты і фатаграфія, я быў зьняволены і прасядзеў

два месяцы. Выпушчанаму казана мне пакінуць Менск і я мусіў выехаць у Ленінград, дзе апынуўся выкінутым на брук, бо вось ужо месяц, як з прычыны вялікай залюднёнасьці і цяжкага жыльлёвага крызысу, не магу знайсьці сабе ня толькі кватэры, але хоць-бы пакойчыка і можа прыдзецца згінуць дзе на вуліцы ад холаду і голаду. Такім чынам не магу ўжо болі пасылаць Вам беларускія кніжкі, каторых пазбаўлены і сам. Калі атрымаеце гэту пісульку маю, то паведомце мяне адкрыткай кароценька, што Вы атрымалі, паводлуг адрасу: Ленінград . . . .

Дагадкі Шыпілы, што „можа прыдзецца згінуць дзе на вуліцы ад холаду і голаду", як бачым, збыліся. 6.VI. 1934 г. ён з гэтым сьветам расстаўся. Пэўне, у яго сьмерці адыграў нейкую роль і яго старэчы век, але ня меншую роль у гэтым адыгралі і варункі палітычнага ссыльнога, з роднай Беларусі выкінутага на брук Ленінграду. Характэрна, што яшчэ ў 1929 г. так цэнную 5-ці тысячную бібліятэку забралі бальшавікі для Бел. Акадэміі Навук, а сабіральніка яе выкінулі на брук. Сапраўды, якая этычная прымітыўнасьць!

* * *

Гэтак скончыў сваё жыцьцё праф. Бр. Эпімах-Шыпіла,—піонэр беларускага адраджэньня, апостал — як некаторыя яго завуць — беларускага народу, апякун беларускай моладзі, ідэовы працаўнік на ніве роднай культуры, гарачы патрыёт, высока-дастойны чалавек і ўрэшце, як трапна кажа д-р Т. Грыб, тварэц у беларускім адраджэньні пары „загляне сонца й у наша ваконца", або пары шыпілаўскай, якая папярэдзіла пару нашаніўскую.

Вялікім у гісторыі беларускага рэнэсансу ёсьць Фр. Багушэвіч, што першы стварыў беларускую нацыянальную ідэолёгію,—няменшы ад яго і — ягоны праз некаторы час сучасьнік — Бр. Эпімах-Шыпіла, што тэорыю Багушэвіча праводзіў у шэрае жыцьцё беларускага народу. Гэтым стварыў ён сабе ў народзе памятнік нерукатворны, да якога вякамі не зарасьце сьцежка травою і які трываць будзе так-жа вякамі...

Д-р Ст. ГРЫНКЕВІЧ.

З зацемак аб характары Беларусаў.

Нашая публіцыстыка даволі шмат ахвяравала месца пытаньню „дзьвёхдушнасьці“ ці „двоедушнасьці“. Пытаньне гэтае мае сваю пазыцыю і на бачынах літаратуры прыгожае ў прозе і паэзіі. Сяньня аднак, прынамся ў Заходняй Беларусі, некалькі вось ужо гадоў тэмы гэтае ніхто не чапае, думаю, што на нашым Усходзе яна таксама ня існуе. На гэта апошняе ёсьць свае, усім вядомыя прычыны.

„Дзьве душы“—гэта толькі адна старана пытаньня з галіны досьледаў псыхолёгічных і трэба думаць, што само зьявішча, у форме, у якой яно было абгаворвана ў нашай літаратуры, мае толькі дачасны характар на аснове агульнага развою суцэльнасьці народу, хаця бязумоўна зьявішча вельмі характэрнае і важнае.

Ня думаю спыняцца над аналізаю „дзьвёхдушнасьці“, яе прычынаў, асноваў, пэрспэктываў на будучыню, а хачу падчыркнуць, што тутака мы бачылі адну із спосабаў аналітычнага падыходу да праблемы нацыянальнага характару. Спробы-ж падыходу сынтэтычнага да гэнае стараны душы народу, наскольні мне вядома, надта нялікія. І трэба сказаць, што нялікасьць гэная шкодная ў першую чаргу для нас самых.

Іншая справа, ці ёсьць даволі „сырца“, з якога можна было-б пабудаваць будыніну больш менш рэальную душы народу беларускага. Кажу аб сырцы, апрацаваным навукова. Хаця зьяўляецца адначасна думка, хутчэй пытаньне, поўнае сумліваў, ці сапраўды гэныя абразы духовага быту, пабудаваныя на канве фактаў сабраных дасьледчыкамі з галіны этнолёгіі, мовазнаўства, гісторыі і г. д. больш блізкія да таго, што зьяўляецца заўсёды нечым няўяўленым ды адначасна найважнейшым, а на што мы кажам „душа народу“, ці мо' лепш яе бачаць у вагні натхненьня людзі, што завуцца песьнярамі-прарокамі...

Тое ўсё, што мы ведаем аб Беларусе, пакідаючы на старане анэкдотычны хутчэй тып мужычка хітруна, хаця і прыбітага бядою, загнанага ўсімі, замкнёнага ў сабе ці зноў апрача таго аснаўнога тону бядульлівасьці, распаўсюджанага і праслаўленага нашымі паэтамі нядаўніх дзён, — ясна, што не адказывае поўнаму абразу чалавека.

Дык калі сяньня і немагчыма нам даць поўнага нарысу аснаўных старон характару — гэнае свомасьці чалавека найважнейшае ў сэнсе вартасьці адзінкі ў плошчы практычнага дзеяньня яго ў жыцьці, усё-ж такі можна прабаваць уявіць тое, што магло быць зафіксаванае на бачынах беларускае характэролёгіі.

Папытаем, што гэта такое наагул характар?

Адказаў пачуем шмат. Возьмем хаця-б такі сказ Гётэ: „Жыцьцё чалавека — гэта ягоны характар“... Характар, знача,

зьяўляецца тою найважнейшаю пружынаю, якая вызначае ўсе шляхі, якая дае аканчальна рэалізацыю тых ці іншых ідэалаў і ідэяў, якая робіць больш ці менш вартасным самое жыцьцё.

Абойм такога акрэсьленьня вельмі шырокі, адначасна аднак рэальна паказуе, што каб сказаць нешта аб характары адзінкі, дык трэба ўзяць ейнае жыцьцё ў цэласьці. Характар—гэта свомасьць вельмі сталая, хаця адначасна быццам цякомая. Характар, як кажа адзін з вядомых псыхіятраў і псыхолёгаў (Кронфэльд), гэта нарадзіны індывідуальнае апрычонасьці ў суадносінах адзінкі з жыцьцём. Інакш кажучы, характар—гэта індывідуальная праява рэакцыі на вонкавае дзеяньне. Ня будзем уваходзіць у спрэчкі паміж адумыслоўцамі, якая розьніца паміж канстытуцыяю ў сэнсе псыхо-этнічнае асноведзі чалавецкага ці нацыянальнага „я", а тэмпэрамантам і характарам. Адно ясна, што тэза аб працяжнасьці лініі жыцьцёвае мае сваю вялікую тутака вагу. Гэта бязумоўны факт, што бяз мінуўшчыны немагчыма нічога сказаць аб будучыні, як немагчыма добра ацаніць сучаснасьць. Гэныя ўсе праявы стульна злучаны паміж сабою.

Дык дасьледжываючы беларускі характар, трэба нам зьвярнуцца да гісторыі і ў мінуўшчыні шукаць адказу на пытаньне. У гісторыі мы наглядна пабачым, што сапраўды гэнае нешта неважомае вызначае рэакцыю адзінкі і згуртаваньня большага ці меншага людзей.

Ігнат Абдзіраловіч у кніжыцы „Адвечным шляхам" падчырківае аснаўную лінію характару беларускага народу, а мяноўна „ваганьне" паміж Усходам і Заходам. Гэнае ваганьне ня будзе хістаньнем паводле аўтара, гэным тэрмінам хоча ён назваць нейкую асаблівую собскую лінію, якое трымаюцца Беларусы на сваім шляху гістарычным. Ужо першы вучоны беларускі, д-р Францішк Скарына, вызначаўся тым, што духова не належаў ані да заходу ані да ўсходу, і гэта магло паказываць, што не здаволівала яго культура ні рымская ні візантыйская, ён шукаў свае арыгінальнае лініі. Адно цікаўнае зьявішча трэба падчыркнуць у думках аўтаравых, што ваганьне, аб якім ён гаворыць, трэба разумець, як асаблівую кансэрватыўнасьць. Беларус неахвотна прымае новае, усёроўна, адкуль яно ідзе і хто яго прыносіць з сабою.

Другая рыса характару, якая кідаецца ў вочы, спыніўшысь на мамэнт толькі на падзеях гістарычных Беларусі, гэта ейная міралюбівасьць, антымілітарызм, як мы казалі-б сяньня. І вось антымілітарызм і кансэрватызм пакідаюць яркія сьляды ад самага раньняга жыцьця Беларусі, як асобнае псыхо-этнічнае адзінкі. Кансэрватызм—гэта свомасьць да некаторае граніцы агульна чалавецкая. Заўсёды можна судзіць аб чалавеку, якім ён будзе, мяркуючы паводле таго, якім ён быў дагэтуль. Рэвалюцыі мае кожны чалавек, аднак рэвалюцыя астаецца заўсёды рэвалюцыяю, значыцца нечым вынятковым, з чым трэба рахавацца пастолькі,

пасколькі. Сяньня маем ужо навучны грунт дзеля разуменьня гэнага кансэрватызму.

Беларусы, як адзінка дзяржаўная, выступаюць на арэну гістарычную даволі позна, хаця не пазьней, як іншыя славянскія пляменьні, асабліва славяне ўсходняе групы. Пляменьні, з якіх аканчальна вырас народ беларускі, значыцца Крывічы, Радзімічы, Дрыгавічы і Севяране, былі параськіданы сярод балотаў і лясоў, дык ня мелі быццам на першы пагляд ніякіх граніцаў і мелі яны іх адначасна ў гэных самых лясох і балотах, якія баранілі іх ад усялякіх навінак, што маглі лучыць з далёкага сьвету. Гэныя ўмовы геаграфічныя пакінулі, зразумела, сьледамкі на псыхіцы людзей. Тутака крыніца неспагаднасьці ўсяму новаму, неспагаднасьці хутчэй пасыўнае, дзеля таго, што ў гісторыі нашай нідзе не наглядаем больш яркага пратэсту. Гэта між іншым пакінула свае сьледамкі на ўсім, што толькі бачым у Беларусаў: у распарадкаваньні жыцьця ўнутранага і арганізацыі вонкавае, ці ў сэнсе рэакцыі на небясьпеку (вайна абаронная) ці імкненьня да карысьці (прыкладам вайна зачэпная).

Каб добра ацаніць павагу гэнага зьявішча, трэба ўмець глянуць на сваю гісторыю так, як яна была ў сапраўднасьці, трэба мець свае „акуляры", каб добра бачыць. Мы лішне часта глядзімо вачыма дасьледчыкаў ці афіцыяльных гісторыкаў расейскіх ці польскіх. Возьмем прыкладам факт, як трэба ацаніць слабасьць дзяржаўную чыста беларускіх твораў з пары полацкае? Ці гэта была няўмеласьць арганізавацца самым? Чаму-ж тады гэныя самыя князі ў пару літоўска-беларускую нашае гісторыі ўмеюць гэтак складна і вясьці войны і будаваць шырока культуру ў галіне правадаўства і пісьменства? Адказ на гэта знаходзім уявіўшы сабе, што маса беларуская заўсёды ўмела вясьці сваё арганізацыйнае ўнутранае жыцьцё. Сям'я, вёска, грамада (як найніжэйшая адзінка адміністрацыйна-самаўрадавая) стаялі заўсёды надта высока і новыя ўмовы з мамэнтам новага правапарадку пасьля скасаваньня паншчыны зноў выявілі, што лепш як дзе ў іншым м'есцы Расейскае Імпэрыі — этнаграфічная Беларусь умела правясьці распарадкаваньне валаснoe гаспадаркі.

Гэны вось антымілітарызм побач традыцыяналізму, як мы сяньня казалі-б, паясьняе нам тую эпоху сужыцьця ў камплексе Літоўска-Беларускае гаспадарсьцьвенасьці. Літоўскія князі сарганізавалі гэны новы дзяржаўны камплекс. Адначасна бачым мы крыху нечаканае зьявішча. Ліцьвіны заваявалі бяскроўна Беларусь, а Беларусы, быццам падняволеныя, пачынаюць кіраваць гэнаю дзяржаваю. Паясьніць гэта нехта хацеў-бы вышынёю культуры тагачаснае Беларусі і ніжэйшым роўням яе на Літве. Але ці гэтакі адказ можа нас поўнасьцю задаволіць? Некаторыя падзеі сучаснасьці, якія адбываюцца на нашых вачох, паказуюць, што незаўсёды вышэйшая культура перамагае ў жыцьці. Ня буду паклікацца на праслаўлены ўжо сказ аднаго з польскіх прэм'ер-міністраў аб ліквідацыі беларускага пытаньня ў працягу

50 гадоў. Сучаснасьць зьяўляецца найлепшым адказам на натугі полёнізацыйныя. Суадносіны паміж чужым элемэнтам і масаю беларускаю паказываюць, што гэны загнаны гаротнік селянін умее зашчапіць свой сьветапагляд, свае абычаі насланаму з культурнаю місіяю да яго асадніку.

Дык ёсьць тады ў нявыразнасьці „хістаньня" беларускага нейкая суцэльнасьць, сіла і трэба папытацца — ці гэта сапраўды нявыразнасьць, ці гэта мо' толькі іншыя адносіны да жыцьця? У гэтай сіле асыміляцыйнай ёсьць мо' нешта, што мерыць трэба мерамі ня розуму, а катэгорыямі рэпрэзэнтаванымі ў паэзіі... Новая пара ў развою падзеяў гістарычных на тэрыторыі беларускай у сувязі ўжо з Польшчаю вызначаецца адыходам вярхоў грамадзянства, якія губляюць свой твар нацыянальны і ў працягу некалькі стагодзьдзяў прытуляюцца да чужое ім псыхікі мазурскае. Ясна, што гэта ня была суцэльнасьць нацыі беларускае, што адкалолася ад свайго камля,—маса, шырокія сфэры грамадзянства асталіся пры берагу гэнае хвалі. Ня гледзячы на гэта „панскія" сфэры, усе тыя вяльможы і магнаты, да канца Рэчыпаспалітае пачувалі сваю апрычонасьць. Лішне далёкаю была псыхіка людзей, якія гаварылі на тую пару аднолькаваю моваю, значыцца польскаю, у Беларусі і ў Польшчы. Няма што ўжо казаць аб мяшчанстве і сялянстве.

Я не ўваходжу ў прычыны, якія выклікалі гэныя працэсы, ці яны былі абаснаваныя і на чым былі абаснаваныя. Бязумоўна тутака, у гэнай плошчы матар'ялістычная дыялектыка магла-б трыумфаваць, яна паказала-б і даказала-б, што шляхта беларуская імкнулася да тых здабычаў сацыяльных і клясавых, якія мела на тую пару шляхта польская.

Цікавімся мы аднак зусім не аб тым. Мы хочам знайсьці толькі адказ на тое, чым зьяўляецца і якім зьяўляецца характар Беларуса не як адзінкі, а як народу. Дык адыход цэлае клясы народу мае свой тутака асаблівы зьмест. Пасыўныя адносіны масаў паказываюць дужа добра на характар полёнізацыі. Гэта быў выплад дзяржаўнае толькі палітыкі, а ніколі нейкае вышэйшасьці, перамогі багацейшае культуры. Што вышэйшасьць культурная мела ды мае ў такіх сытуацыях адноснае значэньне —паказвае хаця-б прыклад падзеяў на польскім Шлёнску. Вялікая і багатая культура нямецкая не магла перамагчы інэртных адносінаў польскага работніка і селяніна. Калі ўжо гутарка аб вышыні культураў, дык можна папытацца, дзе яна была большая ў XIV—XV стагодзьдзях — на Беларусі, з ейнымі жывымі і сьвежымі традыцыямі з Візантыі, ці ў сярэднявечнай тагачаснай Польшчы?.. Які настрой доўга яшчэ вітае сярод сполёнізаваных сфэраў шляхоцкіх — бачым яшчэ ў Міцкевіча, прарока новае польскае эры, у сказе: „Літва, зямелька родная"...

Прыходзіць падзел Польшчы. Дзеля вышэй прыведзеных прычынаў, зразумела, што гэны мамэнт не закрануў глыбей масаў беларускіх. Астаюцца яны чужыя на лёзунгі інтэлігенцыі

польскае ці расейскае, якія хадзілі ў народ з рознымі заклікамі. Селянін беларускі не лавіў паўстанцаў у 1863 г., як гэта было нат' мясцамі ў каранной Польшчы. Мясцамі ён спагадна паглядаў на натугі шляхты прагнаць маскалёў, найчасьцей аднак аставаўся інэртным. Усё гэта ня была ягоная справа. Павадыры тагачасныя ішлі да народу з лёзунгамі далёкімі і чужымі, што ня ўмелі закрануць душы. Тыя павадыры і народ ня мелі супольнага языка. Яшчэ адзін прыклад з адносінаў масы і ейнае рэакцыі з апошніх дзён. Думаю тутака аб Грамадзе. Магутны ўздойм, шуканьне свае формы ўскалыхнула народам і паклікала армію ў рады сялянска-работніцкае арганізацыі. Ці гэта быў сапраўды волат на гліняных нагах, ці ў Грамадзе мо' было яшчэ за шмат чужога?.. Адказываць на гэта было-б сяньня захутка, сяньня маем лішне мала фактычнага матар'ялу ў руках, каб рабіць станаўкія прысуды.

Характар адзінкі зьяўляецца выпладам спадчыны па продках з судзеяньнем асяродзішча. Тое самае трэба сказаць аб характары народу. Асяродзішчам будзе ён сам і ягоныя суседзі. Адначасна падзеі гэнага-ж чалавека ці цэлага народу паказацівамуць на ягоны характар.

Дык што можна казаць аб нашым нацыянальным характары? Апрача вышэй названых і падчыркнутых нахілаў да спакойна-кантэмпляцыўнага жыцьця і любасьці да свайго старадаўняга, трэба сказаць, што не паказаў ён аканчальнае свае формы, у якой ён быў-бы зусім сабою. Паасобныя ўздоймы рэвалюцыйныя—гэта толькі паказальнік, што ёсьць туга, шуканьне свайго шляху. Калі дагэтуль народ беларускі не праявіў у шырэйшым маштабе свайго твару, дык бязумоўна дзякуючы сваім аснаўным рысам, а перадусім вонкавым умовам жыцьця, у якіх ён дасюль знаходзіўся.

Ці гэныя аснаўныя рысы часам ня маюць у сабе прысуду на будучыню, інакш кажучы, ці ня будуць яны тым дзейнікам, дзякуючы якому народ не астоіцца перад азброеным сьветам, асабліва гэным блізкім сьветам суседзяў? Дасюлешняя практыка казала-б нам хутчэй аб тым, што гэная вонкавая нядужасьць мае ў сабе таёмную сілу апору. Жыцьцё цячэ; новыя надыходзячыя хвормы дадуць калісь і Беларусу паказаць сябе, заняць сваё месца паміж іншымі народамі.

Цяжкі шлях Беларуса быў дагэтуль, ня лёгкі ён будзе ў бліжэйшай будучыні. Мы лішне далёкія і іншыя ад сумежных з намі народаў, каб маглі лёгка знайсьці сябе самых. Зарука нашае будучыні ў дзеяньні ў сваёй собскай форме, адказывючай нашаму характару.

Д-р Я. СТАНКЕВІЧ.

Асабовыя назовы па бацьку ў Беларусаў.

Як ведама, у Расейцаў і Украінцаў ёсьць асабовыя назовы па бацьку із суфіксамі — *іч*,—*овіч*, — *евіч*. Гэтак у Расейцаў *Івана Хамёнка* (сына Хамовага) завуць *Іван Фомич*, *Івана Пятронка* (сына Пятровага) завуць *Іван Пятрович*. Таксама ў Украінцаў — *Павло Петрович* Макаренко і інш. Іншыя славянскія языкі гэткіх назоваў па бацьку цяперака ня знаюць. А ў Беларусаў ці ёсьць гэтакія назовы па бацьку? Калі зьвернемся да мовы беларускага народу, дык у ёй назоваў па бацьку на—*іч*,—*овіч*,—*евіч* цяперака не пачуем. Праўда, ня вылучана, што на беларуска-маскоўскім паграніччу языковым можа быць гэткае называньне, але там яно выясьняецца маскоўскім уплывам. Але даўней да XVI стаг. ўлучна ў Беларусаў былі асабовыя назовы па бацьку на — *іч*, — *овіч*, — *евіч*. Гэта ведаем з мноства дакумантаў беларускіх, захаваных з таго часу. Дык чаму аддаць пяршынство—навіне ці старыне? Мова ёсьць зьявішчам жывым, яна разьвіваецца, хоць надта памалу, і разьвіваючыся мяняецца. Дзеля таго новым зьявам маем аддаваць пяршынство перад зьявамі даўнейшымі, умерлымі. Тут трэба аднак уважаць, каб зьмены, страта аднаго ці паўстаньне другога зьяўлялі'ся, як рэзультат *развою*, а ня лічыць самыя зьмены развоем. Бо ня кожная зьмена—развой. Калі чалавек скалечыцца—страціць нагу, руку ці іншую часьць цела, дык гэта таксама зьмена, але ніхто яе развоем не палічыць, хоць-бы нагу дарабілі, а зубы замест „простых" касьцяных уставілі з „дабрароднага" кову—золата. Дзеля таго трэба даведацца, ці страта ў Беларусаў назоваў па бацьку на — *іч*, — *овіч*, — *евіч* зьявілася з прычынаў існуючых у самым беларускім языку ці мо' была занесена ўплывам чужым. У даным прыпадку мог-бы быць толькі ўплыў польскі, бо з моваў, аказуючых уплыў на беларускую, толькі польская ня знае назоваў па бацьку. Польская мова зрабіла ўплыў на асабовыя звароты ў Беларусаў (таксама як у Ліцьвіноў і Украінцаў). Даўнейшых нашых—*спадар*, *спадарыня*, *спадарычна*, каторыя яшчэ ў XVII стаг. даволі шырака ўжываліся, а раней праявілі экспаьсію, пашыраючыся ў Маскоўшчыне ў хворме *сударь*, *сударыня* *), памалу, у працягу вякоў замяніліся польскімі *пан*, *паня*, *паненка*. Гэты самы „пан" ёсьць складовай часткаю нашага неагульна-беларускага „васпан" (з „вашая міласьць пан"). Аднак зварот „пан" і нат' „васпан" ня вылучны ў беларускім языку. Ужываньне яго невялічкае ў прыраўнаньню да іншых асабовых зваротаў беларускіх. Можна ска-

*) З мясцовага, усходне-беларускага спудар (як і цяперака ў Смаленшчыне кажуць кувалак) па выкіненьню п паўстала судар.

заць, што наагул „пан“ у Беларусаў ужываецца ў вадносінах да „паноў“, у клясавым значэньні гэтага слова, ды ў вадносінах да тых, што „выйшлі ў людзі“ і з імі быццам зраўняліся*). Шмат балей за „пан“ пашырана ўжываньне асабовых зваротаў „*дзядзька, цётка*“ ў вадносінах да старшых, „*ваша, вашаць*“ (з „вашая міласьць“). У Магілеўшчыне і Чарнігаўшчыне ды хіба ў сумежных з імі землях жанчыны адны адных завуць „*тайка, таечка*“. З гэтага відаць, што ня „пан“ выціснуў нашыя даўнейшыя назовы па бацьку на — *іч*, — *овіч*, — *евіч*. Апрача таго „пан“ і „спадар“ мелі значэньне аднолькавае, дзеля таго яны ўжывацца разам доўга не маглі і пры спалячэньні вышшае шляхты беларускае і княскіх родаў мусіў перамагчы „пан“, тым балей, што „спадар“ меў праціўніка і з другога боку — царкоўна-славянскага, у слове „*господзь*“, бо словам „спадар“ зварочаваліся даўней Беларусы і да Бога („спадару Божо наш“, маліліся калісь). Тымчасам значэньне слова „пан“ і назоваў па бацьку, хоць і падобнае, але неаднолькавае, і маглі яны ўжывацца побач. Гэта-ж раней „спадар“ зусім добра ўжываўся з назовамі па бацьку. Із сказанага ясна, што беларускія назовы па бацьку на — *іч*, — *овіч*, — *евіч*, шчэзьлі незалежна ад чужога ўплыву.

Цікава аднак даведацца, што было прычынаю шчэзьненьня ў Беларусаў менаваных назоваў па бацьку. У XIV стаг. і раней асабовыя назовы на — *іч*, — *овіч*, — *евіч* (Ільлініч, Пятровіч, Смолевіч) былі толькі назовамі па бацьку, а ня прозьвішчамі. У XVI стаг. асабовыя назовы на — *іч* і г. д. былі часткова яшчэ назовамі па бацьку, а часткова ўжо прозьвішчамі. Той самы Пятровіч быў у вадным прыпадку сынам Пятровым, у другім гэта было прозьвішча. Але з часам, у меру таго, як гэтыя назовы робяцца балей і балей прозьвішчамі, яны касьцянеюць, перастаюць быць жывымі назовамі, дык і немагчыма стала іх тварыць ад бацькавага імені, а тым самым іх ужываньне як назоваў па бацьку чэзьне. Значыцца новае, прозьвішчнае значэньне разгляданых назоваў прычынілася да іх амярцьвеньня, бо калі хто незалежна ад імені бацькі будзе, прыкладам, Хадасевічам, дык гэткі назоў траціць сваё жывое значэньне, робіцца ўмоўным азначэньнем, так як гэрб. У рас. мове, дзе прозьвішчы на — *іч*, — *овіч*, — *евіч* не паўсталі, назовы па бацьку з гэтымі суфіксамі захаваліся дагэтуль. У Украінцаў адно крыху ёсьць прозьвішчаў на — *іч* і г. д. і то галоўна на паўночна-ўкраінскіх землях, дзе яны маглі паўстаць пад беларускім уплывам. Дзеля таго ў украінскай мове захаваліся менаваныя назовы па бацьку. Былі ў старыну назовы па бацьку ў Палякоў, Чэхаў і інш. славян, аб чым сьведчаць географічныя назовы на — *ice* (Katowice), адпавядаючыя беларускім

---

*) З выняткам апошняга часу ў Зах. Беларусі, калі ўсе раптам „распанелі“, сталі „панамі“ й „панямі“. „Паненка“, праўда, была й перад вайною болей пашырана, але далёка ня ўсюдых ды й то адно ў „далікатных“ зваротах дзяцюкоў. Можна спадзявацца, што гэтае „панства“, як і іншыя дзівосныя навіны, з часам шчэзьне.

на *—ічы* (Баранавічы). Прычыны іх шчэзьненьня ў Палякоў і Чэхаў былі накшыя, чымся ў Беларусаў.

Страціўшы адны назовы па бацьку, Беларусы захавалі іншыя іх хвормы, із суфіксамі*—ёнак*, *- онак* (з *енъкъ*), *- ук*,*—ік*,*—(ык)*, *—ок* у сыноў (сын Каралёў — Каралёнак, Рыгараў – Рыгаронак, Карпаў—Карпёнак, Карпюк—Карпік, Касьцюкоў — Касьцючонак, Касьцючок, а ў дачок із суфіксамі — *ішка* (з — *ішъка* з *—іхъка*) і*—анка*, *— янка* (Каралішка, Карпішка, Касьточышка, Каралянка, Карпянка, Касьцючанка). Гэтыя назовы па бацьку таксама даставалі значэньні прозьвішчаў, але не перасталі й дагэтуль ужывацца і як назовы па бацьку, бо не замерлі дзеля таго, што маюць апору ў звычайных словах, такіх, як *маладвёнак* і пад., *камлюк*, *сябрук*, *турук* (зьмяншальныя ад *камель*, *сябра*, *тур*), *кошык*, *ножык*, *столік*, *зубок*, *грыбок*, *каток*. Апрача таго назовы па бацьку із суфіксам — *енак*, — *онак* (*Міхасёнак*) належаць да сям'і назоваў дзяцей на*—нё* (*ня*)*—дзіцянё—*(*ня*), піліпянё, гусянё, чарцянё і інш. Імёны на*—нё* (*—ня*) абазначаюць дзяцё (*Піліпянё*, *Куранё*), а на*—енак* (*—онак*) сына (*Піліпёнак*). Дык зусім забясьпечана быцьцё назоваў па бацьку із суфіксамі — *енак* — (*онак*), *ук* — (*юк*), *ік* — (*ык*), *ёк* — (*ок*), дык-жа словамі, што не дастаюць значэньня прозьвішчаў.

Існуючыя беларускія назовы па бацьку ўжываюцца дзеля тачнейшага азначэньня таго, аб кім гутарка. Гэтак, калі ў якой мясцовасьці ёсьць колькі Міхалоў Міхневічаў, дык дзеля адразьненьня трэба называць і па бацьку*—Міхась Каралёнак Міхневічык*, а жанатага ці наагул незалежнага *Міхал Каралёнак Міхневіч*, а другога *Міхась Васілёнак Міхневічык* (або *Міхневіч*) і інш. Дзеля тачніні назоў па бацьку астанецца ў дачкі й тады, калі яна выйдзе замуж. Гэтак, калі Ганна дачка Васілёва Міхневічышка выйдзе замуж за Вайніловіча, дык яна будзе *Ганна Васілішка Міхневічышка Вайніловічыха*. Называньне гэтакае прасьцейшае, Мягчэйшае й лепшае, як ужыванае ў польскай мове Anna Wojniłowiczówna, córka Wasyla, nazwisko panieńskie Michniewiczówna.

Напасьледак трэба зацеміць, што таковыя называньні пабеларуску, як прыкл. *Дзянісаў,—ва*, *Язэпаў—ва* ня ёсьць назовамі па бацьку, але толькі прыналежнымі прыметамі. Скажуць ня толькі Міхал Дзянісоў, Марыля Дзянісова, але так-жа й конь Дзянісоў, сьвінка Дзянісова.

На падставе вышэйсказанага ясна, што асабовыя назовы па бацьку, як Антон *Міхайлавіч*, Сымон *Ігнатавіч*, і пад. сяньня зьяўляюцца чужымі ў беларускім языку і не павінны яны ўжывацца.

А. КЛІМОВІЧ.

Скасаваньне паншчыны на Беларусі.

За няцэлы год, бо ў лютым—сакавіку 1936 году, міне роўна 75 гадоў ад таго часу, калі на прасторы б. расейскай імпэрыі, куды належала тады і Беларусь, афіцыяльна скасавана была паншчына. Пастанова аб гэтым была абвешчана маніфэстам цара Аляксандра II-га з дня 19 лютага (ст. стыль) 1861 году.

Ніжэй сабрана колькі ўваг аб тым, што змушала касаваць паншчыну і як гэта касаваньне адбывалася на землях этнографічна-беларускіх. Згары трэба пры гэтым зазначыць, што беларускія землі ў той час адміністрацыйна падзелены былі на дзьве няроўныя часьці — усходнюю і заходнюю — і ў кожнай з іх, у справах скасаваньня паншчыны, абавязвалі хоць і падобныя, але далёка не аднолькавыя праўныя нормы. Граніцы гэтых часьцей не пакрываліся з граніцамі сучаснымі. Усходняя частка афіцыяльна называлася „беларускімі губэрнямі"; належалі да яе: уся тагачасная губэрня Магілёўская і гэтак званыя „беларускія паветы" Віцебскай губэрні, паветы: Віцебскі, Вяліжскі, Гарадзецкі, Лепельскі, Невельскі, Полацкі, Себежскі і Суражскі. Уся Смаленшчына была зарахавана да групы губэрняў „вялікарасейскіх", а беларускія паветы Чарнігаўшчыны, як і ўся Чарнігаўская губэрня, — да групы губэрняў „маларасійскіх" (чытай — украінскіх). Гэту часьць Беларусі ўмовімся называць Беларусьсю Усходняй.

Асобнымі правамі кіравана было касаваньне паншчыны ў заходняй часьці беларускіх земляў, якая ў той час ня мела йшчэ асобнага афіцыяльна-урадавага назову (пазьнейшы „Сѣв. Зап. Край") і называлася проста „Губэрні Віленская, Горадзенская, Менская". Сюды належалі так-жа гэтак званыя „ліфляндзкія паветы" Віцебскай губэрні: Дзьвінскі, Дрысенскі, Люцынскі і Рэжыцкі. Да гэтай таксама групы належала і губэрня Ковенская, якую аднак, як не беларускую, мы тут не бяром пад увагу. Землі абнятыя губэрнямі: Віленскай, Горадзенскай, Менскай і „ліфляндзкай" часьцю губэрніі Віцебскай (Дзьвінск, Дрысса, Люцын і Рэжыца) ў дальшых нашых разважаньнях умовімся называць Беларусьсю Заходняй.

Падзел гэты аднак мае значэньне чыста ўмоўнае і адносіцца толькі да разгляданай тут пары 60-тых гадоў XIX стагодзьдзя.

Прыгатаваўчая пара.

Скасаваньне паншчыны актам 19 лютага 1861 г. ня было неспадзеўкай з чыейсь міласьці. Была гэта канечнасьць. Сам цар Аляксандар II-гі выразна сказаў, чаму ён налягаў на скасаваньне паншчыны; ён казаў, што трэба сялянам даць волю зьверху, каб яны самі не ўзялі яе зьнізу. А да гэтага хоць памалу, але няўтомна даходзіла.

Гэтак сама разумелі справу і папярэднікі, і таму, хоць карысталіся прыгоннай працай селяніна, то аднак адчувалі ўсю ненармальнасьць і тады ўжо — сто гадоў перад 1861 г. — былі

змушаны думаць аб тым, як перайсьці да палажэньня хоць больш-менш нармальнага. З падобнымі стараньнямі спатыкаемся яшчэ ў часы самага росквіту паншчыны, пры Кацярыне ІІ-ой. Тагачасныя „стараньні“ аднак былі няшчырымі. Доказ гэтага — здарэньне пісьменьніка Радищева, каторы за апісаньне сваей „Падарожы з Пецярбургу ў Маскву“ і за апублікаваньне канкрэтнага пляну скасаваньня прыгону быў сасланы на доўгалетнюю ссылку ў Сібір *).

Агулам узята, пачынаючы ад часоў панаваньня Кацярыны ІІ (1762—1796), пры Паўле І (1796—1801), Аляксандры І (1801—1825), Мікалаі І (1825 — 1855) і ў пачатку панаваньня Аляксандра ІІ (1855—1881) блудзіла па галовах думка аб тым, як-бы пазбыцца адказнасьці за бязчынствы прыгону, але і захаваць някранутымі ўсе памешчыцкія землі. Іншымі словамі, тагачасныя дзеячы былі заняты „асвабаджэньнем“ сялян, але без надзяленьня іх зямлёй. Малым адступленьнем ад гэтага агульнага кірунку быў закон 1803 г. аб г. зв. „вольных хлебапашцах“, перайменаваных пасьля пры Мікалаі І у „казённых сялян“; вось-жа гэты закон пазваляў (не наказываў!) памешчыкам звальняць сялян ад паншчыны цэлымі сёламі і дварамі, за плату ці бясплатна, але канечна з зямельным надзелам **).

Пры Мікалаі І пачынаюць працаваць над пытаньнем паншчыны г. зв. „сакрэтныя камітэты“. Першы такі К-т быў устаноўлены 6 сьнежня 1826 г. пры ўчасьці ведамага дзеяча Сперанскага. Паважнейшых пладоў працы гэтых Камітэтаў ня было, бо ў склад іх уваходзілі пераважна самі толькі зацікаўленыя ўтрыманьнем паншчыны памешчыкі ды вышэйшае чынавецтва.

У гэту пару ўжо аднак пачынаюць насьпяваць іншыя пытаньні, каторыя справу прыгонных сялян выразна падганялі, хоць-бы і проці волі самых памешчыкаў. Напалеонаўскія войны пхнулі земляробскую гаспадарку б. Расеі на новыя, датуль нязнаныя шляхі. Добрыя цэны на прадукты земляробства „заахвочвалі“ памешчыкаў да палепшаньня спосабаў гаспадаркі: да завядзеньня земляробскіх машын, да лепшага абрабляньня глебы, ужываньня заводнай сяўбы і г. д. Усё гэта вымагала большых коштаў і каб яны аплаціліся, трэба было застасаваць і раўнацэнную працу людзкую. А гэтага ад чалавека прыгоннага, працуючага не з сваей волі, а з мусу, ня можна было ні спадзявацца, ні вымагаць. Дзеля гэтага ў тагачасным грамадзянстве аўтаматычна паўстала пытаньне аб выгаднасьці для самых памешчыкаў ужываць у дварох вольнанаёмную працу.

Да звальненьня прыгонных сялян на волю было аднак яшчэ далёка і ў найлепшым прыпадку пачалася толькі замена прыгону (работы) на грашовы чынш (аброк).

---

*) Рожков: Исторія крѣпостного права в Россіи, Растоў н/Д. 1905 г., бач. 38.

**) Рожков: там-жа, бач. 40.

Пры пачатым працэсе аднак ня можна было ўжо астанавіцца на поўдарозе—трэба было йсьці далей—да поўнай замены прыгону на працу вольнанаёмную. Інакш, гразіў упадак усей сыстэме тагачаснай гаспадаркі. Некаторыя з памешчыкаў ратаваліся паваротам з чыншу ў прыгон і павялічваньнем прыгонных павіннасьцяў. Прывяло гэта ў 1844 г. да ўстанаўленьня з боку ўраду на зах. беларускіх землях (Віленшчына, Горадзеншчына, Меншчына) ведамых Інвэнтарных Камітэтаў, „заданьнем якіх было сьпісаць усе прыгонныя забавязаньні і правы сялян перад дварамі ў кожным паасобным выпадку, у кожнага памешчыка. Гэтак устаноўленых забавязаньняў ня можна было адгэтуль ні зьмяняць, ні павялічываць“ *).

Апрача паказаных прычын прыватна-гаспадарскіх, былі йшчэ і справы іншыя, у каторых зацікаўлена была царская казна і наагул дзяржава. Злоўжываньні прыгонных парадкаў спанукалі сялян да адкрытых бунтаў, лік якіх пры цары Мікалаі І-ым узрос да 556 **). А гэта, пры насьпяваўшай небясьпецы звонку—Крымская вайна—было для ўраду вельмі небясьпечным. Да таго-ж гаспадарскае жыцьцё ўсё больш замірала, падаткі памешчыкамі не плаціліся, казна пуставала. Промысел і гандаль, пры фатальных шляхох спалучэньня (дарогах), былі таксама ў упадку. Для падняцьця і ажыўленьня ўсяго гэтага патрэбны былі супольныя сілы ўсяго народу, які наўперад аднак мусіў быць вольным.

Рашучыя меры. Словам, усё вымагала скасаваньня паншчыны. К чэсьці памешчыкаў з беларуска-літоўскіх зямель трэба сказаць, што яны, хоць перадусім у сваім собскім інтарэсе і пасвоему разумеючы, але ўсё-ж адны з першых з б. царскай Расеі адкрыта выступілі з дамаганьнем вырашэньня сялянскага пытаньня ***). Шляхта зямель гістарычна-літоўскіх (Віленшчына, Ковеншчына, Горадзеншчына) выступала з такімі дамаганьнямі йшчэ ў 1807 і 1818 гадох ****), Смаленскае дваранства дамаганьнем устанаўленьня ў іх Губэрнскага Камітэту для сялянскіх справаў выступіла ў 40-вых гадох мін. ст. *****). Але найбольш важкім для справы скасаваньня паншыны ўва ўсёй б. Расеі было выступленьне шляхты з прастору Віленскага генэрал-губэрнатарства падчас каранацыі цара Аляксандра ІІ у 1857 г. Дамаганьні гэтай шляхты асвабаджэньня сялян ад паншчыны, але без зямлі на ўласнасьць, а толькі з правам карыстаньня ёй на падставе інвэнтарных апісаньняў, былі сьпісаны на сойміку

*) „Калосьсе“, кн. І, бач. 53.

**) Н. Рожков: там-жа, бач. 43.

***) Выперадзілі беларуска-літоўскіх памешчыкаў толькі бароны Курляндыі, дзе ўжо 25.VIII. 1817 г. быў выданы закон аб скасаваньні паншчыны, але без зямельнага надзелу (Pamiętniki J. Gieysztora“, том І, бач. 64).

****) Z. Ludkiewicz: „Podręcznik polityki agrarnej“, том І, бачына 70, Варшава, 1932 г.

*****) Рожков: там-жа, бач. 43.

гэтай шляхты ўлетку 1857 і ў верасьні таго-ж году былі ўручаны цару асабіста Віленскім ген.-губэрнатарам Назімавым. Паслужыла гэта падставай да ведамага царскага рэскрыпту на імя ген.-губэрнатара Назімава з дня 20 лістапада 1857 г. *). Быў гэта афіцыяльны пачатак вялікай рэформы.

Далёка было йшчэ ў гэтым рэскрыпце да сапраўднага скасаваньня паншчыны: прызнавалася ў ім права ўласнасьці памешчыкаў на ўсю зямлю, але сялянам дадзена было права выкупу на ўласнасьць самай сялібы з агародамі ды права карыстацца пэўным абшарам аромай зямлі, сенажацяў і лесу за аброк або прыгон на карысьць памешчыка і далей, пазвалялася сялянам арганізаваць свой вясковы самаўрад, выбіраць солтысаў і г. д., але над усім і далей захоўвалася панская паліцыя і суды.

Мала гэта было, але пачатак быў зроблены і водступу ня было. Апошні „Сакрэтны Камітэт", устаноўлены 3.І. 1857 г., у пачатку наступнага 1858 г. быў перайменаваны ў „Галоўны Камітэт для сялянскіх спраў", каторы не бяз урадавага націску арганізаваў, натуральна—памешчыцкія г. зв. „Губэрнскія Камітэты" для сялянскіх спраў.

Ад часу, калі на чале „Галоўнага Камітэту" стаў мікалаеўскі генэрал-ад'ютант Я. І. Ростовцев, пад уплывам Мілютина ў праграму дзейнасьці Галоўнага Камітэту былі паложаны наступныя пункты: 1) асвабаджэньне сялян бяз выкупу іхняй асобы, 2) арганізаваньне вясковага самаўраду без памешчыцкай („вотчыннай") паліцыі і юстыцыі (судоў) і 3) асвабаджэньне сялян з зямлёй (сялібы, поле, луг, лес і г. д.).

Усьлед за гэтым былі сарганізаваны тры г. зв. Рэдакцыйныя Камісіі: 1) для утварэньня агульных праўных асноваў аб сялянах, што выйшлі з паншчыны, 2) для утварэньня такіх-жа асноваў памесных і 3) для падрабязнага апрацаваньня спосабу выкупу зямлі. Для абсуджэньня (але не пастанаўленьня) працы Рэдакцыйных Камісіяў двойчы былі вызваны прадстаўнікі „дэпутаты" ад Губэрнскіх Камітэтаў. Гэтыя прадстаўнікі, а таксама і Галоўны Камітэт (пасьля сьмерці Ростовцева ў пачатку 1860 г.) вельмі абрэзалі праекты сялянскіх надзелаў і паднялі выкупную за іх плату. Яшчэ больш зьмяніліся на горшае варункі надзелу ў Дзяржаўнай Радзе („Государственный Совѣт"), дзе ўрэшце 7 лютага 1861 г. **) разгляд праекту закону быў закончаны і 19 лютага падпісаны ведамы „маніфэст", аб'яўлены 5 сакавіка 1861 г. У Вільні і Віленшчыне гэты акт быў абвешчаны толькі 9-га сакавіка 1861 г. ***).

---

*) Pamiętniki J. Gieysztora, том I, бач. 56, Вільня 1913 г.

**) П. И. Лященко: История Русского Народного Хозяйства—Масква — Ленінград 1930 г.

***) „О дѣйствіях Виленского Губернского по крестьянским дѣлам присутствія", Віленскі Архіў: К. G. G., 1861—1862 г. № 931.

Гэтак скончыўся ў нас адзін з многіх этапаў,—але не апошні,—барацьбы за зямлю і за волю.

Важнейшыя пастановы рэформы 19.II. 1861 г.

Пасьля афіцыяльнага скасаваньня паншчыны ўсё гаспадарчае жыцьцё — часткава і самаўрадавае—кіравалася: агульным законам („палажэньнем“) аб сялянах, што выйшлі з паншчыны, памеснымі законамі, асобнымі для беларускіх земляў на ўсходзе і асобнымі на заходзе і шмат іншымі, спэцыяльнымі. Ацэнка гэтых законаў вымагала-б сьпісаньня цэлых тамоў. Да атрыманьня зямлі, паводле выдадзенага закону, былі ўпаважнены толькі тыя поўналетнія паншчызьняныя гаспадары, якія былі ўпісаны ў агульна расейскі перапіс („рэвізію“) 1858 г. Аб самым-жа надзеле агульна можна сказаць, што ён быў так абмяркаваны, каб мог толькі прывязаць сялян да зямлі і гэтым самым забясьпечыць памешчыкам танныя работніцкія рукі ды пазволіць ім здаваць зямлю ў арэнду за нячувана высокую цану.

Афіцыяльна паводле закону з 19.II. 1861 г. сяляне да часу ўстанаўленьня „устаўных грамат“ *) аставаліся на тых гаспадарках, дзе яны былі прад „асвабаджэньнем“ і адраблялі за гэта пастарому паншчыну ці плацілі чынш умоўлены ў інвэнтарных апісаньнях.

У справе выкупной цаны закон устанаўляў цьвёрдую цану толькі на сялібы і агароды, а аб рэшце трэба было селяніну „вольна“ ўгаварвацца з памешчыкам. Пры выкупе зямлі асабліва цяжкай для сялян была г. зв. сыстэма градацый, паводле якой першая дзесяціна надзелу цанілася як палова ўсяго надзелу, другая дзесяціна — як чвёртка гэтага надзелу, а ўся рэшта разам узятая — таксама як чвёртка. Пры гэтай сыстэме выкупу памешчыкі фактычна бралі забаронены афіцыяльна выкуп асобы селяніна.

Тых сялян, каторыя „дабравольна“ адказваліся ад права на надзел, закон пазваляў надзяліць чвёрткай належнага ім надзелу, але бясплатна. Скарысталі з гэтага асабліва буйныя памешчыкі, а сяляне—„дарственьнікі“—сталіся першымі кандыдатамі ў батракі і да жабрачай торбы.

Выплата надзелу была так абдумана, што селянін меўся сплачываць свой надзел казьне ў працягу 49 гадоў, а казна сама разрахоўвалася з памешчыкамі. Гэтак устаноўленая сплата мелася кончыцца толькі ў 1932 г., але скончылася ўжо па першай расейскай рэвалюцыі ў 1905 г.

Устанаўляўся ўрэшце вясковы самаўрад, з сваімі сходамі і сваім валасным судом.

---

*) „Устаўныя граматы“ гэта нібы „купчыя“ на сялянскія надзелы. Мусілі яны быць кончаны за 2 гады ад часу выданьня закону, г. зн. да 19.II. 1863 г.

Памесныя законы для беларускіх зямель. Памесны закон для ўсходніх беларускіх земляў — аднолькавы з законам для земляў вялікарасейскіх — устанаўляў два разьмеры надзелаў: вышэйшы і ніжэйшы. Ніжэйшы надзел раўняўся аднэй траціне надзелу вышэйшага. Вышэйшы надзел у гэтай часьці Беларусі па паветах прадстаўляўся гэтак: па 3½ дзесяціны *) у Смаленскім павеце, па 4 дзесяціны— у паветах: Мсьціслаўскім, Ельнінскім, Красенскім і Рослаўскім; па 4½ дзесяціны—у паветах: Віцебскім, Лепельскім, Невельскім, Себескім, Гомельскім, Клімавіцкім, Капыскім, Магілеўскім, Аршанскім, Сеньнінскім, Чаўскім, Чэрыкаўскім, Бельскім (Смал. губ.), Дарагабускім, Духаўшчынскім і Парэцкім, па 5 дзесяцін —у паветах: Гарадзецкім, Полацкім і Сураскім і па 5½ дзесяцін —у паветах: Вялiскім, Быхаўскім і Рагачэўскім.

За ўстаноўлены такім чынам вышэйшы надзел той-жа закон устанаўляў наступны аброк: па 8 руб. — у беларускіх паветах Віцебшчыны і ў паветах: Бельскім, Дарагабускім, Духаўшчынскім, Ельнінскім, Красенскім, Парэцкім, Рослаўскім і Смаленскім—Смаленскай губ., па 9 руб. ува ўсей Магілёўшчыне.

Прыгону (работы) за адзін вышэйшы надзел у тэй самай часьці беларускіх земляў назначалася 40 дзён мужчынскіх і 30 дзён жаноцкіх.

Варункі надзелу і сплаты ў беларускіх паветах Чарнігаўшчыны былі іншыя. І так: у паветах Старадубскім і Чарнігаўскім вышэйшы надзел і агародняй зямлі выносіў 4 дзесяціны, а вышэйшы разьмер пешага ўчастку (?) польнай зямлі — 6 дзесяцін. Адпаведныя надзелы ў паветах: Мглінскім, Сураскім і Навазыбкаўскім былі 4½ дзесяціны і 7 дзесяцін. За дзесяціну польнай зямлі ў першых двух паветах законам у год было назначана 14 дзён прыгону або 1 руб. 60 кап. чыншу, а ў апошніх трох паветах—12 дзён прыгону або 1 руб. 40 кап. чыншу.

На заходня-беларускіх землях павіннасьці сялян за надзел і далей, да часу „ўстаўных грамат“, кіраваліся забавязаньнямі Інвэнтарных Камітэтаў, з нязначнымі толькі аблягчэньнямі, касуючымі павіннасьці дадаткавыя і рачовыя. Рабочы дзень улетку рахаваўся 12 гадзін, а ўзімку—9 гадзін. У „ліфляндзкіх“ паветах Віцебшчыны (Дзьвінск, Дрыса, Люцын, Рэжыца) лік працоўных дзён за надзел калыхаўся ад 12 да 23, залежна ад таго, да каторай з 9-цёх катэгорыяў належаў дадзены двор.

Абавязкі чыншовых сялян на зах.-беларускіх землях аблічаліся, паводле закону, на падставе агульнай вартасьці (ў грашах) павіннасьцяў запісаных у інвэнтарным апісаньні, але ня больш 3 руб. за дзесяціну надзелу. Тыя-ж абавязкі сялян за дзесяціну надзелу ў Віцебскіх паветах калыхаліся, залежна ад катэгорыі двору (І—ІХ), паміж 1 р. 65 кап. і 3 руб.

*) На „рэвісскую душу“, г. зн. на поўналетняга мужчыну запісанага ў 1858 годзе.

Усё гэта толькі сухія нормы закону, які меўся абавязываць на нашых землях ад 19.II. 1861 г. Жыцьцё аднак шмат зьмяніла, аддаючы кіраўніцтва сялянскім пытаньнем таго часу ў рукі перадусім гэтак званых „Губэрнскіх канцэлярыяў для сялянскіх справаў *). Рассьледаваньне архіваў гэтых установаў—сягоньня на вялікі жаль мала, а па часьці і зусім недаступных — павінна кінуць больш сьвятла на цэлую справу. Сягоньня-ж, ацэньваючы самы акт 19-га лютага 1861 г. з пэрспэктывы трох чвертак стагодзьдзя, ня можна ня прызнаць працы і добрай волі тых людзей, каторыя гэты закон стараліся правесьці.

На сваю пару быў гэта пачын не малы. Каб скасаваць аднак паншчыну і ўсё, што з ёй лучылася, самага толькі закону было йшчэ мала. Для сапраўднага раскрэпашчэньня сялянства патрэбны былі сільныя людзі, якія падчас узрастаньня на сіле рэакцыйных колаў ня мелі доступу да ўрадавых установаў. Таму іскра волі тлела аж да часу 1-ай (1905-6 г.) і асабліва 2-ой (1917 г.) расейскай рэвалюцыі, выбухаючы падчас гэтай апошняй у вялікі пажар, які не загас яшчэ да сягоньня і які напэўна не супакоіцца датуль, пакуль чалавек наш ня толькі на словах, але і на дзеле не перастане быць прыгонным нявольнікам ды не зажыве на сваей зямлі, як непадзельны гаспадар.

Кнігапіс.

Міхась Лынькоў: „На чырвоных лядах“, повесьць, кніга першая—„Ціхія сялібы“. Менск 1934 г. бачынаў 322.

Малады беларускі пісьменьнік Міхась Лынькоў, знаны дасюль з сваіх высокамастацкіх апавяданьняў, прыступіў цяпер да вялікае повесьці „На чырвоных лядах“, якой частка першая п. н. „Ціхія сялібы“ выйшла ўжо ў сьвет. Гэты твор вышынёй свайго артызму як і літаратурнай культурай аўтара належыць да ліку найлепшых беларускіх повесьцяў і дзеля гэтага варта над ім шырэй задзержыцца.

Першую рэцэнзію гэтае повесьці даў Якуб Колас у першай кніжцы „Полымя Рэвалюцыі“ за 1934 год, разглядаючы твор Лынькова з пункту гледжаньня марксаўскае крытыкі, г. зн шукаючы ў ім перадусім утылітарных вартасьцяў, а амаль зусім памінаючы яго вартасьці артыстычныя. Мы пастараемся падыйсьці да гэтае повесьці з гледзішча артыстычнага, уважаючы згодна з сучаснай заходня-эўрапэйскай крытыкай, што вартасьць літаратурнага твору залежыць не ад ідэолёгіі, у ім выражанай, але ад яго мастацкасьці. Ды ўрэшце іначай цяжка нам падыходзіць да літаратурных твораў, што выходзяць у Радавай Беларусі, дзе

*) „Губернскія по крестьянским дѣлам присутствія“.

дзякуючы жорсткаму палітычнаму рэжыму аўтары вельмі часта мусяць праводзіць такую думку, якая для іх самых ёсьць чужой і якой з прыемнасьцю выракліся б пры іншых абставінах.

У першую чаргу трэба адцеміць, што Лынькоў, дзякуючы вялікім літаратурным здольнасьцям, патрапіў стварыць повесьць новага тыпу, адказуючую вымаганьням сучаснае эстэтыкі, прыгэтым добра апанаваў тэхніку вялікшага літаратурнага твору. Агульны характар повесьці ёсьць эпопэічны. Аўтар дае нам малюнак жыцьця беларускага прыдняпроўскага мястэчка ў часы сусьветнае вайны, перад самай рэвалюцыяй. Гэты малюнак ёсьць поўны, тыповы і рэпрэзэнтатыўны для дадзенае пары, бо аўтар вельмі шырака й рэалістычна закрануў цэлы рад жыцьцёвых пытаньняў і праблемаў, паказаў вельмі вялікі лік, можа нават за вялікі, розных тыпаў сялянскіх, жыдоўскіх, чыноўніцкіх, духоўных, не забываючыся нават аб уцікачох з Горадзеншчыны і аб пленных аўстрыяках. Гэтае грамадзянства прадставіў аўтар зусім натуральна, у плошчы соцыяльных узаемаадносінаў, паказваючы з аднаго боку масу эксплёатаваную, а з другога—самых эксплёататараў, з пасярод якіх асабліва рэалістычна намаляваў кулака Цыбала і некулькі жыдоў-местачкоўцаў. Паміма нязвычайна вялікага ліку пэрсонажаў, повесьць ня робіць уражаньня пераладованай, бо кожная асоба мае сваё месца, кожная думае пасвойму і мае іншы знадворны выгляд. Аўтар з вялікаю ўмеласьцю патрапіў углыбіцца ў псыхолёгію беларускага селяніна і жыда-местачкоўца і дзеля гэтага ягоныя тыпы зьяўляюцца проста ўзятымі з жыцьця.

Усе асобы зьяўляюцца ўмела ўплеценымі аўтарам у акцыю повесьці і паказаны на шырокім і багатым фоне знадворнага быту беларускага сялянства і яго звычаяў. Няма тут амаль ніводнага абраза ці сытуацыі, зьвязаных з вясковым жыцьцём, якія-б ня былі паказаны ў асьвятленьні тыпова беларускім. Ці гэта будзе апісаньне ўнутранага сямейнага жыцьця, хатніх сварак і клопатаў, ці жыцьця больш агульнага,—як сялянскія сходкі, фэст царкоўны,—ці ўрэшце палявой працы або сьвяточнага адпачынку,—усюды вельмі выразна зарысоўваецца беларускі бытавы малюнак. Маючы наўвазе прадставіць поўны й рэалістычны абраз беларускага жыцьця, аўтар не апісвае выпадкаў і здарэньняў нязвычайных, рэдкіх, агранічваючыся амаль выключна да зьяваў штодзенных, шэрых, якія з кожным днём прыносіць жыцьцё. Прыгэтым Лынькоў ніколі не стараецца ідэалізаваць беларускага сялянства, наадварот, прадстаўляе яго такім, якім яно ёсьць, апісваючы яго добрыя й благія бакі. Усё гэта прыдае повесьці высока рэалістычны характар, якім апраўдываюцца некаторыя вульгарныя выражэньні і звароты, што спатыкаюцца ў повесьці, а за якія абураецца Колас. Гэтая рэалістычная бытавая абрысоўка, побач з умелым адбіцьцём сялянскай псыхолёгіі, стварае такое ўражаньне, што повесьць Лынькова зьяўляецца асабліва бліскай і мілай для беларускага чытача; калі-б

яе, здаецца, перакласьці на чужую мову і даць прачытаць чужніку, які ня знае беларускага сялянскага жыцьця, то выдалася-б яна для яго бледнай і аднастайнай.

Калі глянуць на кампазыцыю повесьці, то і тут заўважым цікавае зьявішча, у значнай меры ўзалежненае ад вельмі шырокага бытавога малюнку твору. Агульнай фабулы, як і аднаго ці некулькіх галоўных герояў, каля якіх гуртаваліся-б усе эпізоды і матывы повесьці, у „Ціхіх сялібах" няма зусім, а ўспомненыя абразкі й эпізоды можна часам перастаўляць з аднаго мейсца на другое, што нічым повесьці не пашкодзіла-б. Такі тып эпічных твораў у новай сусьветнай літаратуры спатыкаецца вельмі часта; у нашай літаратуты можна ўспомніць хоць-бы камэдыю Я. Купалы „Тутэйшыя", якая фактычна ня мае т. зв. драматычнага вузла, ня мае дзеяньня, а ўся яе сцэнічнасьць палягае выключна на прадстаўленьню найбольш характэрыстычных тыпаў сучасных аўтару людзей і іхніх паглядаў на сьвет. Другое, што варта адцеміць у будове повесьці, гэта яе вялікая зьлітнасьць. Тут мы ня знойдзем доўгіх і нудных абразоў і апісаньняў, як напр. у повесьцях Ц. Гартнага. Дзеяньне тут разгортваецца шыбка, аўтар ніколі доўга не задзержываецца над адным прадметам. Напр. абразы прыроды, якія ў Коласа вельмі шмат займаюць месца, тут прадстаўлены коратка, але затое метка і выразна. Гэтак сама характэрызуе Лынькоў свае асобы ўсяго толькі некулькімі словамі, але гэтыя асобы, дзякуючы адпаведным прыраўнаньням, зарысоўваюцца ў нашым выабражэньні вельмі выразна, напр.: „На клірасе дзяк пеў. Сухі, як тая трэска, ён выгінаўся ўюном, над дзяўчатамі камандаваў і над сухарукім Яўхімам". Усяго некулькі слоў патраціў аўтар, каб паказаць сухога, як трэску, дзяка, што выгінаецца ўюном перад хорам. І гэтак усюды.

Лынькоў на акружаючы сьвет і людзей стараецца глянуць праз прызму хараства. Шматлікія абразкі з штодзеннага сялянскага і жыдоўскага жыцьця, непазбаўленыя жыцьцёвай шэрасьці і аднастайнасьці, а часам агіды, якія, здавалася-б, павінны выклікаць ад'емныя эстэтычныя ўражаньні, выходзяць у Лынькова вельмі поэтычна. У сваім адчуваньні красы там, дзе яе для звычайнага вока няма, пісьменьнік падобны да М. Багдановіча, які ў постаці вясковай дзяўчынкі „ўпэцканай, і хілай, і худой", бачыў абраз Рафаэляўскай Мадонны („У вёсцы"). Гэтая рыса вельмі характэрная для Лынькова, дзеля гэтага прыглядзьмася ей бліжэй. Напрыклад абдзёрты і запэцканы жыд выдаецца аўтару прыгожым у сваей няпрыгожасьці: „У Іцкі агнём гараць на сонцы і доўгая рудая барада, і космы валос, і пераліваецца ўсімі вясёлкавымі колерамі прамусоленае крысо залапленага, зашытага і перашытага адзеньня". Вельмі цікавы абраз, у якім аўтар апісвае багаслужэньне ў царкве. Згодна з савецкімі вымаганьнямі аўтар павінен чарніць рэлігію і змагацца з ей, а тымчасам Лынькоў з любасьцю ўглядаецца на абраз багаслужэньня ў цар-

кве, які цікавіць аўтара перадусім з боку мастацкага: „Адны стаялі ўнурыўшыся і падцягнуўшы сухія паблеклыя вусны, узіраючыся туды, дзе грала сонца пазалотаю аўтара, адкуль расплываліся блакітныя клубы салодкага дыму, адкуль чашу поп выносіў, дзе адчыняліся і зачыняліся залатыя палавінкі дзьвярэй з чырвонай заслонай. Старэйшыя варушылі вуснамі і ў шэптах тых усё больш Багародзіца была, дзева тая прачыстая, Мацер Божая".

Напасьледак коратка трэба зьвярнуць увагу на стыль і мову повесьці, якая таксама прадстаўляе не малую цікавасьць. У стылю, як і ў іншых элемэнтах повесьці, знаць вялікі рэалізм і імкненьне ўлавіць і перадаць памастацку тон і характар народнае мовы. Але апрача гэтага ў стылю Лынькова ёсьць і нешта зусім асаблівае, часамі ён выдаецца вельмі аднастайным і манатонным, часам чуваць у ім архаічны лад, але разам з гэтым адзначаецца ён мілагучнасьцю і плаўнасьцю. У мове Лынькова спатыкаем вельмі многа магілеўскіх правінцыяналізмаў, з пасярод каторых ёсьць многа нязнаных у літаратурнай мове. З гэтае прычыны Я. Колас зрабіў закід Лынькову. На наш пагляд пісьменьнік у гэтым не памыліўся, бо ягоная мова суладна гармонізуе з высока рэалістычным характарам повесьці і моцна падчырківае яе лёкальны грунт дзеяньня. І Міцкевіч у сваіх польскіх творах многа ўжываў беларускіх словаў і выражэньняў, якія артыстычна былі апраўданымі і дзеля якіх ніхто з польскіх дасьледчыкаў яму закідаў не рабіў.

З гэтых агульных увагаў вынікае, што „Ціхія сялібы" ў разьвіцьці беларускае повесьці займаюць выдатнае мейсца, як твор вялікае артыстычнае вартасьці. Аўтар повесьці, Міхась Лынькоў, стаўся адным з найздальнейшых сучасных пісьменьнікаў побач з Міхасём Зарэцкім, Кузьмой Чорным і многімі іншымі беларускімі прозаікамі Усходняе Беларусі. **Ст. Станкевіч.**

„Księga pamiątkowa ku uczczeniu czterechsetletniej rocznicy wydania Pierwszego Statutu Litewskiego pod redakcją doktora Stefana Ehrenkreutza, Wilno 1935, Rozprawy Wydziału III Towarzystwa Przyjaciól Nauk w Wilnie, Tom VIII, str. 362".

Як паказывае сам назоў і кароткая прадмова рэдакцыі, кніга гэта была распачата яшчэ ў 1929 г. з прычыны прыпадаўшых у ім 400-тых угодкаў I Літоўскага Статуту. Няспрыяючыя абставіны перашкодзілі выдаць яе раней як у сёлетнім годзе і ў разьмеры меншым, чымся намерана. У кнізе зьмешчаны працы выдатных польскіх гісторыкаў і праўнікаў. Працы прысьвечаныя аналізе I Літоўскага Статуту невялікія і разглядаюць паасобныя праўныя інстытуцыі Статуту. Гэтак праф. Фр. Боссоўскі разглядае квэстыю ўлады бацькоў пазбаўляць дзяцей спадчыны ў прыпадках цяжкай з іхняга боку зьнявагі, Кароль

Кораныі разглядае некаторыя пастановы Статуту ў галіне права каральнага, Рафал Таўбеншляг разглядае квэстыю позву ў I і II Статутах і ўрэшце Станіслаў Пташыцкі ў двух артыкулах закранае ўжо III Літоўскі Статут („Pierwsze wydanie trzeciego Statutu i jego przeróbki“ і „Konfederacja Warszawska 1573 r. w trzecim Statucie Litewskim“).

Вялікшае значэньне маюць і падрабязьней распрацаваны артыкулы на тэмы гістарычныя. З іх трэба перадусім адцеміць працу Яна Адамуса пад наз. „Państwo Litewskie w latach 1386—1398“. Аўтар разглядае тут праблему інкорпарацыі гістарычнае Літвы да Польшчы на аснове акту Крэўскае вуніі. Дзеля таго, што ў гэтым годзе прыпадае юбілей Крэўскае вуніі, праца Я. Адамуса ёсьць асабліва актуальнай. Дагэтуль ды й цяпер у польскай гістарычнай навуцы пануе пагляд, быццам Крэўская вунія пазбавіла гістарычную Літву (г. зн. Беларусь) яе дзяржаўнае самастойнасьці і зрабіла з яе звычайную польскую правінцыю, а толькі салінскія здарэньні 1398 г. ці акты віленска-радамскія 1399 — 1400 — 1401 гадоў вярнулі йзноў Літве ейную дзяржаўнасьць. Гэты пагляд зьяўляецца зьместам г. зв. „тэорыі інкорпарацыі“ Літвы да Польшчы, якой найгалаўнейшым прадстаўніком у польскай гістарычнай навуцы быў А. Левіцкі. Паўстала-ж гэта тэорыя дзеля таго, што няма беспасярэдніх доказаў, быццам існаваў агульны акт інкорпарацыйны, які ўлучаў Літву да Польшчы як правінцыю. Абаронцы інкорпарацыі маглі апірацца толькі на гіпотэзах, дзеля абаснаваньня каторых шукалі тых ці іншых гістарычных здарэньняў.

Ян Адамус у сваей працы вельмі падрабязна і пераконываюча зьбівае прынятыя дагэтуль аргуманты за тэорыяй інкорпарацыі. Перадусім-жа аўтар адрозьнівае два паняцьці сярэднявечнае інкорпарацыі ў форме ўлады беспасярэдняе ці пасярэдняе над тэрыторыяй інкорпорованай і кажа, што калі і прыняць за факт інкорпарацыю Літвы да Польшчы ў 1386 г., дык магла-б гэта быць толькі інкорпарацыя пасярэдняя. Наагул-жа Адамус уважае, што адзінага інкорпарацыйнага акту ня было, але былі меншыя акты і кожны з іх зьдзейсьніваў часткова інкорпарацыю на малой тэрыторыі. Дзеля гэтага аўтар з усіх дасюлешніх аргумантаў за інкорпарацыю выбірае фактычна адзін. Ёсьць ім г. зв. „гомогіяльныя акты“ літоўска-бел. князёў з 1386 — 1398 гадоў. У гэтых-жа актах, паводле інтэрпрэтацыі праф. Бальцэра, літоўска-бел. князі выказывалі адзнакі падданства (hołdu) ня толькі Ягайлу, але і Ядвізе і асабліва Польскай Кароне. З гэтага быццам і выплывае вывад, што гэныя князі паасобку прызнавалі сваю залежнасьць ад кароны, а дзеля таго інкорпарацыя ў сэнсе „ўлады пасярэдняе“ была і правялася паступова прынамся адносна тэрыторыяў гэтых князёў.

Трэба аднак зацеміць, што калі аўтар вельмі ўдала зьбівае аргуманты за існаваньнем адзінага інкорпарацыйнага акту, дык

выдаецца рызыкоўным апіраць частковую інкорпорацыю, у разуменьні аўтара, толькі на ўспомненых актах гомогіяльных. Перадусім, сам аўтар добра зьмяншае іхняе значэньне, калі кажа, што знаходзяцца яны ў якойсь мала выразнай сувязі з венам (wianem) для Ядвігі на землях беларуска-літоўскіх. Факт запісу Ягайлай на карысьць Ядвігі вена на абясьпячэньне ейнага пасагу (хоць-бы гэтага пасагу й ня было) не падлягае сумлеву. І правільна аўтар далей заўважае, што сучасьнікі лучылі адносіны Польшчы да Літвы з адносінамі пасагу да вена. А калі-ж беларуска-літоўскія князі ў успомненых актах і зьвярталіся апрача Ягайлы і да Ядвігі, дык гэта ня можа быць бясспрэчным доказам інкорпорацыі, бо асоба Ядвігі юрыдычна ня была ім чужой. Наступна няма зусім згоднае інтэрпрэтацыі гомогіяльных актаў і квэстыя гэтая вымагае свайго дасьледаваньня. Урэшце супроць прыняцьця інкорпорацыі нават частковай і ў разуменьню аўтара (форма пасярэдняга ўладаньня) сьведчыць і той факт, што ў пазьнейшых актах, якія гэтую інкорпорацыю быццам касуюць, няма аб ёй успаміну (а гэта-ж было-б здарэньне першараднае вагі), хоць гэтыя акты зьявіліся праз 12 гадоў, значыцца ў часе, калі памяць аб ёй павінна была-б быць асабліва жывой. Можна было-б прытачыць яшчэ аргуманты супроць інкорпорацыі, але і вышэй пададзеныя прамаўляюць затым, што гіпотэза інкорпорацыі нават юрыдычнай ёсьць надта слаба абаснаванай, фактычнае-ж інкорпорацыі бязумоўна ня было.

Гэнрык Лоўмянскі даволі падрабязна спыняецца над асновамі грамадзкімі і гаспадарчымі вуніі („Uwagi w sprawie podłoża społ. i gosp. unji jagiellońskiej"). Аўтар апіраецца часткова і на ўспомненай вышэй працы Адамуса, аднак у поглядзе на інкорпорацыю з ім не згаджаецца і трымаецца погляду выробленага Левіцкім. З цэлай працы насоўваецца між іншым вывад, што ў Бел. Літоўскай дзяржаве існаваў вялікі антаганізм між элемэнтам этнографічна - літоўскім (аукштота і жмудзь), і рускім (беларускім і пачаткова ўкраінскім) і што этнографічныя Літоўцы, падбіўшы элемэнт „рускі", імкнуліся да ўтрыманьня свайго пануючага становішча над элемэнтам беларускім нават коштам дзяржаўнае незалежнасьці. Гэты вывад трэба прызнаць памылковым. Калі напачатку літоўскіх „падбояў" і магчымы быў гэты антаганізм, дык у кожным прыпадку ён хутка зьнік. Прычынаў да гэтага было шмат. Перадусім літоўскія „падбоі" былі такога роду, што вельмі часта беларускія князі лучыліся з Літвой дабраахвотна. Далей ўтар адумысна зьмяншае ўплыў рускай (беларускае) культуры на ліцьвіноў этнографічных. Ужо за Альгэрда пры літоўскім двары панавала беларуская мова, а Ягайла інакш не гаварыў, як пабеларуску, беларуская мова зрабілася ўрацавою нават у часы гэгэмоніі этнографічна-літоўскага элемэнту; ліцьвіны хутка зжываліся з рускай (беларускай) людносьцю і асымілявaліся, што сьцьвярджае і аўтар. Падобныя зьявішчы былі-б зусім немагчымымі, каб дапусьціць, што антаго-

нізм між этнографічнымі літоўцамі (аукштота і жмудзь) быў на толькі вялікі, каб прымушаў першых дзеля барацьбы з другімі гадзіцца нават із згубаю дзяржаўнае незалежнасьці! Апрача гэтага аўтар апэруючы статыстычным матар'ялам, вартасьць каторага вельмі сумлеўная, нязвычайна зьмяншае ролю беларускага элемэнту ў супольнай дзяржаве.

Г. Лоўмянскі стараецца паказаць, што важнымі прычынамі да вуніі з Польшчай былі зьявішчы натуры грамадзкае і гаспадарчае ў тым сэнсе, што Літва, каб дапяць у сябе пажаданых эканамічных ці грамадзкіх рэзультатаў, сьведама йшла на вунію, а пасьля па дасягненьню іх „ня думала аб сплаце доўгу ўдзячнасьці і акты вуніі de facto анулявала". Што эканамічныя і грамадзкія фактары пхалі паасобныя краіны да бліжэйшага злучэньня—рэч вядомая, але ўплыў гэтых фактараў, як прадстаўляе аўтар, зьяўляецца незразумелым. Адсюль і супярэчнасьці ў вывадах аўтара. Між іншым ўтар заўважвае, што аукштота і жмудзь імкнуліся да вуніі з Польшчай, каб утрымаць гэгэмонію над рускім элемэнтам і што Польшча сваё забавязаньне споўніла цалком, толькі этногр. ліцьвіны былі няўдзячнымі. Тымчасам паводле аўтара аказалася, што польская помач прычынілася да роўнапраўнасьці рускага элемэнту ў гіст. Літве. Але-ж аб гэтым аукштота і жмудзь, нават паводле аўтара, Польшчы не прасілі і замеру такога ня мелі і чаму павінны былі мець удзячнасьць за такую ўслугу. Падобнага роду навязаньне гістарычных здарэньняў ёсьць немагчымым.

На наш пагляд немагчыма абаснаваць польска-літоўскіх вуніяў інакш, як толькі ўмовамі характару палітычнага. У хвіліну вонкавае небясьпекі Літва лучылася цясьней, а калі небясьпека мінала, вунія фактычна пераставала існаваць і злучаны зьвяз распадаўся лёгка.

На гэтым кончым агляд успомненай кнігі. Кніга бязумоўна павінна быць прастудыявана беларускімі гісторыкамі, бо ў агульную скарбніцу веды аб Вялікім Княстве яна ўносіць вартасны ўклад.

М. Шкялёнак.

З жалобнае карты.

УЛАДЗІМЕР ЖЫЛКА.

Нядаўна атрымалі мы сумную вестку ад Беларусаў з Латвіі аб сьмерці маладога беларускага поэты Уладзімера Жылкі. Але, як падае „Родны Край" 10.V. с. г. № 10, на падставе інфармацыі аднаго з беларускіх уцікачоў з Менску, Жылка памёр яшчэ ў 1933 г. на Паволжы, куды быў сасланы бальшавіцкімі ўладамі за сваю беларушчыну.

Поўных дадзеных аб жыцьці поэты нажаль ня маем. Радзіўся праўдападобна ў 1900 г. у Меншчыне. Вышэйшую асьвету

здабыў у Празе Чэскай, дзе студ'яваў славянскую філёлёгію і будучы ўжо абсольвэнтам выехаў у 1926 г. у Менск, каб узяць удзел у канфэрэнцыі дзеля рэформы белар. правапісу. У Менску Жылка астаўся на сталае жыцьцё. Там прыступіў да шырокай поэтыцкай працы, аб якой, за выняткам некалькіх вершаў, надрукаваных у 1927 г. у часапісе „Узвышша", нічога нажаль ня ведаем. У літаратурным жыцьці быў Жылка бясспрэчна дзейны, бо калі ў 1929 г. пачалося вострае прасьледаваньне бальшавіцкімі ўладамі беларускіх культурных працаўнікоў у Б.С.С.Р., уважалі яго за вялікага шкодніка. Нават яшчэ ў мінулым годзе бальшавіцкія крытыкі на бачынах „Полымя Рэвалюцыі" кляймілі творчасьць Жылкі, як „нацдэмаўскую", ставячы поэту ў радзе слаўнае поэтыцкае чацьвёркі (У. Дубоўка, М. Лужанін і Я. Пушча), якая не захацела прызнаць сваіх памылак, падзяляючы з гэроізмам лёс многіх Беларусаў.

Першыя творы Жылкі друкаваліся ў Вільні: у 1923 г. лірычная поэмка „Уяўленьне", а ў 1924 г. зборнічак вершаў „Наростані". У № 5 „Студэнскае Думкі" за 1925 г. знаходзім некалькі высокамастацкіх вершаў Жылкі з цыклю „Вільня".

Ідэйным зьместам сваей творчасьці і яе мастацкімі асаблівасьцямі належыў Жылка да новага пакаленьня беларускіх поэтаў, якое, вызваліўшыся з „нашаніўскіх" традыцыяў, пачало тварыць новы літаратурны кірунак. Замест дасюлешняга суму й жальбы над нядоляй народу, галоўнай нотай твораў Жылкі,— гэта радасьць, вялікая бадзёрасьць, моцная вера ў будучыню, а ў сувязі з гэтым іх урачысты тон.

Брацьці, зраблю вас багатымі,
Зорамі высаджу край.
Сонцам зазьзяе над хатамі
Словаў маіх каравай.

Большасьць дагэтуляшніх аглядчыкаў твораў Жылкі згодна падчырківаюць адну іх рысу галоўную — адраджэнскія матывы. Прадметам поэтыцкіх захапленьняў ёсьць Беларусь, яе сучаснае адраджэньне і недалёкая будучыня, якую поэта бачыць сьветлай і шчасьлівай; апрача гэтага ўчуцьцёвасьць поэты моцна рэагуе на вонкавае хараство Беларусі, яе прыроду.

Як артыст, Жылка стаіць у радзе вельмі здольных беларускіх паваенных поэтаў. Памінаючы некаторыя заганы ў яго творчасьці, пераважна тэхнічныя, — творы Жылкі адзначаюцца глыбокім лірызмам, гарачымі захапленьнямі поэты над прадметам сваіх успрыйманьняў і вялікаю размавітасьцю рытмікі. Прыкладам, некаторыя часткі „Уяўленьня", дзякуючы багацьцю рытмаў і іншым артыстычным дзейнікам, зьяўляюцца запраўднымі пэрламі.

Перадчасная сьмерць Жылкі—гэта вельмі вялікая страта для нашай літаратуры. Але і тое, што пакінуў нам у спадчыне, сабранае і належна ацэненае, будзе вялікім укладам у скарбніцу нашае поэзіі, а сьветлае памяці Імя Поэты азорыць несьмяротнасьцю.

Ст. Ст.

Культурная хроніка.

З дзейнасьці Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

На агульным гадавым сходзе Рады Інстытуту дня 31.III. сёлета была падлічана дзейнасьць гэтае інстытуцыі за мінулы год і апрацаваны плян працы на год наступны. Было сконстатавана, што асабліва цяжка весьці арганізаваную культурную працу на правінцыі дзеля розных прычынаў; з розных прычын адміністрацыйныя ўлады ў многіх мейсцах закрылі існуючыя гурткі Інстытуту (паветы: Маладэчанскі, Ашмянскі і Баранавіцкі), а так-жа не дазволілі закладаць новых (пав.: Наваградзкі і іншыя). Паміма гэтага Інстытут мае сяньня ў розных паветах Заходняе Беларусі больш чымся 20 дзейных гурткоў, з іх амаль кожны мае сваю бібліятэку і праяўляе культурнаасьветную працу. І так у справаздаўчым годзе адбылося ўва ўсіх гурткох каля 100 вечарынаў і іншых таварыскіх імпрэзаў, каля 40 лекцыяў, больш 50 тэатральных прадстаўленьняў.

У цэнтры Інстытут зьвяртае вялікую ўвагу на працу навуковага характару і з гэтай мэтай яшчэ ў мінулым годзе зарганізаваў чатыры сэкцыі: а) эканомікі і статыстыкі, б) этнографіі і архэолёгіі, в) гісторыі і соцыялёгіі і г) літаратуры і мастацтва. Сэкцыі апрацавалі ўжо рэгуляміны свае дзейнасьці і прыступілі цяпер да працы. Апрача гэтага Інстытут прыступіў да арганізаваньня агульнай бібліятэкі і музэю; праца ў гэтым кірунку вядзецца з добрым пасьпехам. Наладжаны абмен выданьнямі з навуковымі ўстановамі ў краі і заграніцай, між іншым з Беларускай Акадэміяй Навук у Менску. У бягучым годзе пастаноўлена зьвярнуць асаблівую ўвагу на выдавецкую працу і распачаць між іншым перадрукі лепшых твораў беларускіх поэтаў і пісьменьнікаў Усходняе Беларусі. **Т.**

—о—

Дзесяцігодзьдзе беларускай савецкай кіноматаграфіі.

У першай палавіне сакавіка сёлета ў Савецкай Беларусі адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя беларускай савецкай кіноматаграфіі. Праўда, юбілей гэты прыпадаў у 1934 годзе, але сьвяткаваньне яго чамусьці адбылося ў сёлетнім годзе. У юбілейныя дні савецкая прэса апублікавала спэцыяльныя артыкулы, якіх аўтары падчырківаюць дасягненьні беларускай савецкай кіноматаграфіі за 10 год яе існаваньня.

Беларуская савецкая кіноматаграфія, як і ўсяго Савецкага Саюзу, ёсьць магутным дзейнікам камуністычнай агітацыі і пропаганды бальшавіцкіх ідэяў. Рэпрэзэнтуе яна адну з вельмі важных галін культуры Савецкай Беларусі,—нацыянальнай па форме і камуністычнай па зьместу.

Над разьвіцьцём беларускай сав. кіноматаграфіі працуе спэцыяльная, адна з маладзейшых у Сав. Саюзе— з увагі на арганізацыйнае афармленьне — кіноарганізацыяў, т. зв.

Белдзяржкіно - трэст (Трэст Беларускага Дзяржаўнага Кіна пры С.Н.К. Б.С.С.Р.). Ня маючы сільнай тэхнічнай базы, Белдзяржкіно пачало сваю працу ў 1924 годзе ад маленькай кінохронікі. Але ўжо ў 1927 годзе прыступіла да пастаноўкі вялікіх мастацкіх абразоў, як „Лясная быль". У канцы гэтага 1927 году яна мела ў Ленінградзе сваю кінофабрыку — п. н. „Савецкая Беларусь". Спатыкаючы сваё другое дзесяцігодзьдзе, Белдзяржкіно мела каля 40 мастацкіх фільмаў (гукавыя і нямыя), 23 інструкцыйна-навучальныя і 17 абаронча-навучальных.

У супярэчнасьці з ацэнкай якую падаў б. дырэктар кінофабрыкі „Савецкая Беларусь" А. Некрашэвіч у сваім артыкуле п. з. Шлях беларускай кіноматаграфіі" (№№ 11 і 12 часапісу „Советское кино" 1934 г.), кажучы, што „беларуская кіноматаграфія за 10 гадоў не дала ні аднаго яркага, арыгінальнага, бліскаючага сьвежасьцю твора", — Б. Шумяцкі, начальнік галоўнага кіраўніцтва кіно-фотапрамысловасьці пры СНКСССР, у артыкуле „Дзесяць гадоў беларускай кіноматаграфіі" („Звязда" № 53, 1935 г. Менск) кажа, што „барацьба за якасьць прадукцыі для работнікаў беларускай кіноматаграфіі была справай актуальнай і першачарговай важнасьці" І гэта, паводле яго думкі пацьвярджаюць такія фільмы, як „Лясная быль", „Нянавісьць", „Да заўтра"— рэжысара Тарыча, „Шчасьце"—рэжысара Файнцымэра, „Зварот Нейтана Бекера" — рэжысараў Шпіса і Мільмана, „Першы ўзвод" — рэж. Корша, „Двойчы народжаны"—рэж. Аршанскага, „Першае каханьне" — рэж. Шрэйбэра, „Паручык Кіжэ" — рэж. Файнцымэра.

Калі ходзіць аб тэматыку бел. сав. кіноматаграфіі, то ня мела яна тэматыкі толькі беларускай, абмяжаванай граніцамі БССР, не адлюстроўвала яна ў мастацкіх абразох дасюль — нават у марксыцка-ленінскім асьвятленьні—барацьбы беларускага народу. Праўда, былі фільмы: „Кастусь Каліноўскі", „Песьня вясны" і інш.—продукцыі Белдзяржкіно—якіх тэмай была нацыянальна-вызвольная барацьба беларускага народу, але гэтыя фільмы ў выніку процібеларускага паходу ў Савецкай Беларусі—зьняты з экрану.

Успомнены ўжо намі А. Некрашэвіч, які ў сваім часе граміў беларускую нацдэмаўшчыну, а каторага сяньня „Звязда" бічуе за ягоны быццам бел. нац.-дэмократызм, у артыкуле сваім кажа, што з 40 мастацкіх фільмаў выпушчаных за 10 гадоў існаваньня Белдзяржкіно, толькі 15 зьвязаны з беларускай тэматыкай і што „большасьць тэмаў беларускага савецкага кіна магла быць вырашана любой, савецкай кіноматаграфіяй". „Задачай першых гадоў надыходзячага новага дзесяцігодзьдзя — кажа далей Некрашэвіч — зьяўляецца рашучы паварот к нацыянальнай тэматыцы і праз яго да стварэньня яркіх мастацкіх твораў, надаючых сваё асаблівае творчае „я" ўсей прадукцыі. Карацей кажучы, твораў пасапраўднаму нацыянальных па форме і соцыялістычных па зьместу". З гэтага бачым, што тэматыка ў беларускіх савецкіх фільмах дасюль ня мела амаль нічога супольнага з жыцьцём беларускага народу, з яго гісторыяй, барацьбой, рэвалюцыйным рухам, была яна тэматыкай агульнасаюзнай. Ясная рэч, што такі стан тэматыкі і, як пабачым ніжэй, стан работніцкіх кадраў у беларускай кіноматаграфіі — гэта вынік вялікадзяржаўніцкага расейскага шавінізму.

З новых фільмаў, якія фігуруюць у пляне вытворчасьці ў 1935 г., сцэнарыі якіх ужо знаходзяцца ў стадыі абгаварэньня і зацьверджаньня, — гэта „Акадэмік Зорын"—аб праблемах вялікага Дняпра, „Стварэньне сьвету" — аб перасяленьні жыдоў у Бірабіджан, „Дняпро ў вагні".

Сярод рэжысараў, якія працуюць у Белдзяржкіно, вызначыліся ў першую чаргу—І. В. Тарыч, В. В. Корш, А. М. Файнцымэр і іншыя.

У сцэнарнай рабоце праявілі дзейнасьць: Брадзянскі, М. Чарот (напісаў сцэнарый для фільму „Лясная быль"), Таўбэ, Тынянаў, Кобец і інш. Работнікі кіно ня маюць яшчэ патрэбнай творчай сувязі з беларускімі пісьменьнікамі. У характары апэратараў выявіліся Кальцаты, Шлюглейт, Рабаў, у характары актараў—Кміт, Сьвердловая і інш.

Сярод рэжысараў, сцэнарыстаў і

іншых катэгорыяў работнікаў, няма амаль зусім беларусаў. Кіраўніком Белдзяржкіно ад 10-ці гадоў зьяўляецца А. І. Галкін, нагароджаны за сваю работу ордэнам працоўнага чырвонага сьцягу.

У галіне разьвіцьця вясковай і гарадзкой сеткі кінотэатраў Белдзяржкіно выканала за 10 гадоў не малую работу. У Савецкай Беларусі ў 1924 г. былі 63 кінотэатры, а ў 1934 г. 982, („Звязда" № 57, з 11.III. 1935 г) Паводле Шумяцкага—у 1925 г. было кінотэатраў 63, у 1934 — 1227, з іх вясковых 567, у гэтым-жа ліку 58 гукавых. Шумяцкі не гавора нічога аб межах тэрыторыяльных кіносеткі.

Фабрыка Белдзяржкіно „Савецкая Беларусь", якая знаходзіцца яшчэ цяпер у Ленінградзе, у пачатку 2-га дзесяцігодзьдзя будзе пераведзена ў Менск, у гэтым часе будзе ў Менску пабудавана новая кінофабрыка. Я. Ш.

—о—

Выстаўка абразоў Аркадзя Салаўёва.

1-28 лютага сёлета адбылася ў Празе, у галярэі Рубэша, выстаўка абразоў маладога беларускага мастака Аркадзя Салаўёва. Гэта выстаўка — другая ўжо, як і першая, ладжаная ў красавіку 1933 году, мела вялікую прыхільнасьць у чэскага грамадзянства. Ветліва і прыхільна адняслася крытыка. У справаздачах, якія зьмешчаны аб выстаўцы ў штодзенным друку: „Narodni Listy", „Narodni Politika", „Narodni Osvobozeni", „Lidove Listy", „Pravo Lidu", „Poledni Listy" ды інш.—аднагалосна падчырківаецца, што наш беларускі мастак, вучань прафэсара Отакара Нэедла (школа пэйзажу), не змарнаваў апошніх двух гадоў, не супакоіўся і ня спыніўся на сваіх першых творах — ідзе далей, уважліва і пільна працуе над сабой, над удасканаленьнем тэхнікі свае мастацкае творчасьці: прыбірае і ўводзе новыя колеры, паглыбляе кампазыцыю сваіх абразоў. У яго творчасьці праяўляецца значны поступ: зьнікае шэрая цьмянасьць і зьяўляюцца праменьні сонца. Адчуваецца ўплыў францускае школы пэйзажу; асабліва Каррота.

Нельга не адзначыць, пры гэтым, што ў творчасьці А. Салаўёва ўсьцяж ёсьць нешта сталае і трывалае: ён быў і астаецца сумна-тужлівым лірыкам прыроды. Ці гэта будуць вербы над рэчкаю, ці адзінокія сосны ў лагчыне, бярозавы гай на прадвесьні—на ўсім ляжыць адзнака смутку і ціхай тугі, быццам у чаканьні чагосьці. Нават і залатыя праменьні сонца ўпіраюцца недзе ў шэра-цьмяныя хмары і толькі водблескам сваім асьвятляюць даліну з яе расахатымі дрэвамі, зялёным дыванам травы і колернымі плямамі кволых кветак, адлюстроўваюцца ў цьмяна-прагляднай вадзе сажалкі, быццам у ціхай задуме ўзіраюцца ў вочы глядзельніка, выклікаюць пачуцьцё тугі і жаданьня — больш волі, больш сонца!

Як гэта мо' і ня дзіўна, але мастацкая ўява прыроды ў Аркадзя Салаўёва мае нешта супольнае з тымі колерна-апісовымі абразамі беларускае прыроды, якія сустракаемо ў вялікага мастака беларускага слова—у Якуба Коласа (Тараса Гушчы). Прырода ў іх творчасьці—гэта быццам маладая матка, якая чакае нараджэньня свайго першага дзіцяці: поўна нязьведанай тугі і кволай ласкі.

Аркадзь Салаўёў паходзіць з Дзьвіншчыны. Радзіўся ў мястэчку Колуп у 1902 годзе. У 1920 годзе скончыў Дзьвінскую рэальную гімназію. У 1921 годзе быў слухачом на курсах беларусазнаўства, якія ладзіла Т-ва „Бацькаўшчына", прымаў дзейнае ўчасьце ў беларускім жыцьці ў Дзьвіншчыне. У 1922 годзе паехаў на студыі ў Прагу. Спачатку паступіў на тэхніку, але яго вабіла мастацтва. У 1924 годзе вытрымаў конкурсны экзамен у Чэскую Акадэмію Мастацтва, якую скончыў у 1931 годзе з пахвальным дыплёмам, як адзін з найлепшых вучняў праф. О. Нэедла. Яшчэ на акадэмічных выстаўках — вясеньнія выстаўкі ў Акадэміі Мастацтва, якія ладзіліся кожны год,—А. Салаўёў вызначаўся мяккасьцю колераў сваіх настраёвых краявідаў з некаторым адценкам засмучанасьці і тугі па сьвеце, па шырокай прасторнасьці. За свае працы атрымліваў пахвальныя ды-

плёмы і камандыроўкі ў Італію, Францыю, Нямеччыну. Апошнія чатыры гады працуе ў сваім атэльле ў Празе, часам выязджаючы на вёску. Матывы свае творчасьці чэрпае з чэскае прыроды, пераважна з тых яе мяйсцовасьцяў, якія зьбліжаюцца да нашай беларускай прыроды, з яе нізінамі і прасторнымі лугамі. Асабліва замілаваньне мае да вазёрнабалоцістых пэйзажаў.

Трэ‘ спадзявацца, што з часам, калі разьвеіцца шэра-цьмяны туман над нашай роднай краінай і ўзыйдзе сонца волі, якое сваімі праменьнямі асьвеціць працу ўсіх яе верных сыноў, Аркадзь Салаўёў вернецца на бацькаўшчыну і прыме дзейнае ўчасьце ў будаўніцтве Беларускае Акадэміі Мастацтва. Мо‘ зьменіцца тагды і характар яго творчасьці — зьдзейсьніцца туга па ясным сонцы!

Т. Г.

—о—

25 гадоў беларускага тэатру.

Дня 25 лютага сёлета мінула 25 гадоў ад часу, калі адбылося першае легальнае беларускае прадстаўленьне. У гэны памятны дзень 25 лютага 1910 г., у Вільні, у залі т. зв. Палескага Клюбу (сягоньня заля Віленскай літоўскай гімназіі) першы раз адбылася легальная б е л а р у с к а я вечарына, у праграму якой між інш. уходзілі: зьбеларушчаная п‘еса Крапіўніцкага „Па рэвізіі“, хор пад кіраўніцтвам ведамага кампазытара Л. М. Р а г о ў с к а г а і народныя беларускія танцы пад кіраўніцтвам І г н а т а Б у й н і ц к а г а. Самым прадстаўленьнем кіравалі Бурбіс і Францішк Аляхновіч. Бурбіс—сягоньня ўжо нябожчык, а Аляхновіч працуе над беларускім тэатрам дагэтуль і сьвяткуе таксама 25-тыя ўгодкі гэтае працы.

З сьвяткаваньнем падвойнага юбілею—тэатру і працы для тэатру Фр. Аляхновіча—віленскія беларусы крыху прыпазьніліся, бо сышліся толькі 17 сакавіка сёл. У гэты дзень у залі Віленскай Музычнай Кансэрваторыі быў сарга[illegible]заваны адумысны вечар, у пр[illegible] якога ўвайшлі 1) рэфэрат [illegible] Грышкевіча, 2) трэці акт др[illegible]ляхновіча „Цені“, і яго-ж 1-акта[illegible] камэдыя „Чорт і баба“, 3) беларускі хор пад кіраўніцтвам Р. Шырмы і 4) беларускія народныя танцы („Лявоніха“).

Варункі працы для справы беларускага тэатру ў мін. чэцьверці стагодзьдзя былі вельмі трудныя. Значная зьмена на лепшае зарысавалася прад 1929 годам у Радавай Беларусі‘ дзе тэатральная праца была пастаўлена на адпаведнай вышыні. У Заходняй Беларусі ў тую-ж пару для справы беларускага тэатру добра прыслужылася тэатральная аб‘ездная трупа Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Тут так-жа нямала зрабілі для справы мясцовыя гурткі таго-ж Інстытуту і Т-ва Бел. Школы.

Па гэтай кароткай вясьне аднак раптам наступіла сьцюдзёная зіма. У Заходняй Беларусі польскія ўлады не пазволілі аб‘езднай трупе Інстытуту весьці сваю працу, а ў Усходняй Беларусі падзеі ведамыя пад назвай „чысткі ад нацдэмаўшчыны“, калі ня спынілі ўсяе справы, дык вельмі яе выкрывілі і затармазілі, адбіраючы ўсей тэатральнай працы беларускі зьмест. Пры гэткіх невясёлых вонкавых абставінах мінула 1-шая чэцьверць стагодзьдзя працы над беларускім тэатрам. На самым парозе 2-гой чэцьверці пачаў у Вільні працу над беларускім тэатрам заслужаны працаўнік на гэтай ніве грам. Фр. Аляхновіч і ў кароткім часе патрапіў сарганізаваць тымчасам 2 прадстаўленьні.

Пажаданьнем усяго беларускага грамадзянства ёсьць, каб прадстаўленьні беларускія, на пачатак прынамсі ў Вільні, перасталі быць спорадычнымі, а выліліся ўрэшце ў арганізаваную хворму с т а л а г а б е л а р у с к а г а т э а т р у

А. М.

Выдавец: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры

Рэдакцыйная Калегія: М. Шкялёнак, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, Ст. Станкевіч і Я. Шутовіч.

Адказны Рэдактар: Ян Шутовіч.

Да Беларускага Грамадзянства.

„Калосьсе“ — гэта адзіны літаратурна-навуковы часапіс у Заходняй Беларусі. Дзеля разьвіцьця й пашырэньня роднае культуры, выдаваньне яго ёсьць неабходным грамадзкім наказам. Але пашырэньне і пасьпех часапісу перадусім будзе залежыць ад зразуменьня й матар'яльнае помачы Беларускага Грамадзянства. Выдаецца „Калосьсе“ із месячных складак і ахвяраў Грамадзянства, якое належна зразумела вялікую патрэбу такога часапісу і горача адклікнулася на нашу просьбу. Усім тым, хто прышоў з матар'яльнаю помаччу ў выдаваньні часапісу, складаем на гэтым месцы шчырую падзяку Да тых Грамадзян, якія яшчэ не задэкляравалі свае помачы,— зьвяртаемся з гарачай просьбай зрабіць гэта ў найхутчэйшым часе. Кожны, хто дасьць складку на „Калосьсе“, гэтым прычыніцца да разьвіцьця беларускае культуры.

Выдавецтва.

ПАПРАЎКА: З прычыны друкарскага недагляду апушчаны тры апошнія сказы ў апавяданьні М. Машары „*Па хлеб*“, якія тут падаём: „О, Вялікі Бог! Як трагічна сяньня гучыць Твой справядлівы прысуд! Ён заблытаўся і прапаў у хаосе людзкіх праў, законаў і праўды нашага часу“. З гэтае-ж прычыны апушчана слова „даўгімі“ ў другім радку верша А. Бярозкі „*Зімовым вечарам*“. Павінна быць:

„Пад ціхі шум твайго верацяна
Снуюцца думкі плоймамі даў[illegible]і...“

Рэдакцыя.

КАНФІСКАТА „КАЛОСЬСЯ“. Кніжка 1-шая нашага часапісу „Калосься“ — у лютым месяцы некалькі тыдняў па выхадзе ў сьвет была адміністрацыйнымі ўладамі сканфіскаваная за вершы М. Машары „На пералом“, „Я хачу, каб ты сьпявала“ і верш А. Гурыновіча „Перш душылі паны, што шляхтай зваліся“. Акружны Суд у Вільні аднак не знайшоў у гэтых вершах супярэчных з правам мамэнтаў і кафіскаты не зацьвердзіў, у выніку чаго адміністрацыйныя ўлады вярнулі нам забраныя экзэмпляры „Калосься“.